ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН ЗЛУЧАЙЦЕСЯ! פראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַראייניקט זיך! ПРОЛЕТАРИИ ВСЕХ СТРАН, СОЕДИНЯЙТЕСЬ! PROLETARJUSZE WSZYSTKICH KRAJÓW, ŁĄCZCIE SIĘ!

Адрэс РЭДАКЦЫІ І КАНТОРЫ: Менск, Пляц Волі № 17. 1-шы паверх.
Тэл.: Сакратара—№ 478, Рэдактара—№ 769, Канторы—№ 244, Сектара прамысловасьці—№ 615

XI ГОД ВЫДАНЬНЯ ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

№ 7 (3096) ПЯТНІЦА 9 СТУДЗЕНЯ 1931 ГОДУ

КОШТ НУМАР У КАП.
Падпісная плата: На 1 месяц — 90 к.; 3 — 2 р. 70 к.; 6 — 4 р. — к.; 1 год — 8 р. — к.

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў і Савету Народных Камісараў Б. С. С. Р.

Трэцяя Сэсія ЦВК Саюзу ССР

Узьняць ролю саветаў у правядзеньні бальшавіцкай лініі на практыцы— адна з галоўнейшых задач сучаснага моманту (Молатаў)

Аб народна-гаспадарчым пляне на 1931 год

Даклад Старшыні СНК СССР тав. В. М. Молатава (Скрабіна)*)

Забесьпячэньне

Пытаньне аб забесьпячэньні рабочых непарыўна зьвязана з іншымі задачамі народна-гаспадарчага пляну. Да справы забесьпячэньня мы павінны цяпер падыйсьці, як да аднэй з галоўнейшых умоў сацыялістычнай вытворчасьці. У нас ёсьць дастатковыя прадпасылкі для далейшага палепшаньня забесьпячэньня рабочых у 1931 годзе. Гэта відаць ужо з таго, што фонд прамтавараў шырокага спажываньня з 11,5 мільярдаў руб. у 1930 годзе, узрастае да 14,6 мільярдаў руб. у 1931 годзе, што разам з ростам фонду сельска-гасп. тавараў павінна павялічыць розьнічны зварот на 25-30 проц. у параўнаньні з мінулым годам. Цыфры гавораць самі за сябе.

Два словы аб становішчы важнейшых прадуктаў харчаваньня—хлеба. Партыя і савецкая ўлада, на аснове посьпехаў саўгаснага і калгаснага будаўніцтва дамаглася ўжо вырашэньня ў асноўным зернавой праблемы. Ход хлебазагатовак сьведчыць, што хлебам нашая краіна будзе забясьпечана. Калі да студзеня 1930 году мы загатовілі 891 мільёны пуд., то да студзеня 1931 году мы змаглі загатовіць ужо 1.252 мільёны пуд. Такім чынам, у параўнаньні са спрыяючым агульным ходам загатовак мінулага году мы маем у гэтым годзе павялічэньне загатоўленага хлеба на 358 мільёнаў пуд. Упяршыню сапраўды значная частка ў гэтых загатоўках прыпадае на саўгасы і калгасы (каля паўмільярда пудоў). Нельга не падкрэсьліць посьпехаў загатоўчай работы машына-трактарных станцый. Гадавое заданьне па здачы хлеба дзяржаве МТС выканалі ўжо на 122 проц. У гэтым годзе мы пашырылі экспарт хлеба, што мае вялікае значэньне для ўвозу неабходных нам машын і, у прыватнасьці, трактараў і камбайнаў. Аднак плян хлебазагатовак яшчэ ня цалкам выканан і наша задача—давесьці яго выкананьне да канца. Растуць загатоўкі і па такіх важнейшых для задавальненьня патрэб шырокіх мас сельска-гаспадарчым прадуктам, як буракі і хлапок.

Загатоўкі хлапка ў пачатку 1930 году ўжо перавысілі загатоўкі ўсяго папярэдняга году. Ня гледзячы на гэта патрэбна ўсё-ж весьці далейшую і самую ўпартую барацьбу за выкананьне пляну загатовак хлапка. Моцна ўзрасьлі ў параўнаньні з мінулым годам і загатоўкі буракоў. Супроць загатоўленых у мінулым годзе цукровых буракоў у колькасьці 6.038 тыс. тон, у гэтым годзе мы загатовілі ўжо 13.805 тысяч тон. Значыць, загатоўкі цукровых буракоў бягучага году больш чым у два разы перавышаюць загатоўкі мінулага году.

Разам з тым мы ня можам задаволіць цалкам узрастаючай патрэбы ў прадуктах жывёлагадоўлі. Калі мы ўжо пасьпяхова вырашылі ў асноўным зярнёвую праблему, то гэтага яшчэ нельга сказаць аб праблеме жывёлагадоўлі. Недахват жывёлагадоўчых прадуктаў (мяса, масла, малака) будзе яшчэ досыць сур'ёзна адчувацца на працягу некаторага часу. Але праведзеныя ў 1930 годзе і намечаныя на 1931 год мерапрыемствы ў гэтай галіне забясьпечваюць рашучы зрух у гэтай справе. Гэта відаць хоць-бы з параўнаньня росту пагалоўя жывёлы ў саўгасах да вясны 1931 г. супроць вясны 1930 году. Колькасьць буйной рагатай жывёлы ў саўгасах 953.000 галоў у 1930 г. ужо да вясны 1931 г. узрастае да 2.900 тысяч; колькасьць сьвіней у саўгасах павялічваецца з 150 тысяч да 1.690 тысяч галоў і колькасьць авечак павінна ўзрасьці з 2,5 мільёна галоў да 5 мільёнаў. Да восені-ж 1931 году пагалоўе жывёлы ў саўгасах павялічыцца яшчэ больш. У нашым друку ўжо адзначалася, што саўгасы ў жывёлагадоўчых сродках да канца 1931 году будуць займаць тэрыторыю агульнай плошчай 54 мільёны га, г. зн. значна больш усёй тэрыторыі такой дзяржавы, як Нямеччына, або як Італія, Аўстрыя і Данія ўзятыя разам. Разам з тым пачынае шпарка разьвівацца жывёлагадоўчая справа ў калгасах. Адначасова задачы палепшаньня забесьпячэньня жывёлагадоўчымі прадуктамі вымагаюць далейшых мер па палепшаньні справы загатовак гэтых прадуктаў як у сацыялістычным сэктары, так і ў аднаасобнай сялянскай гаспадарцы. У трэцім годзе пяцігодкі з асаблівай рашучасьцю і энэргіяй павінна быць пастаўлена і вырашана пытаньне аб самой арганізацыі забесьпячэньня. Партыя і савецкі ўрад прызналі дзейнасьць органаў забесьпячэньня па мясу, гароднiне, ды і ўсю арганізацыю забесьпячэньня спажывецкай кааперацыі нездавальняючай. Між тым ад забесьпячэньня залежыць вельмі многае пры выкананьні ўсяго народна-гаспадарчага пляну. Таму задача карэннага палепшаньня работы кааперацыйна забесьпечваючых органаў, задача неаслабнай і бязьлітаснай барацьбы з бюракратызмам у гэтых органах, не гаворачы ўжо аб бязумоўным выкарчоўваньні шкодніцкіх элемэнтаў, павінна быць пастаўлена перад рабочай клясай, як адна з баявых задач сёньняшняга дню.

Кадры

Калі партыя ўжо дабілася сур'ёзнага зруху ў справе арганізацыі і падрыхтоўкі новых тэхнічных кадраў, дык зараз перад намі паўстала з усёй вастратой праблема рабочых кадраў.

Шпаркі тэмп індустрыялізацыі краіны, размах будаўніцтва і калгасны рух прывялі ня толькі да ліквідацыі беспрацоўя, але і востра, ужо ў 1930 г. паставілі пытаньне аб недахваце рабочай сілы ў радзе раёнеў. У 1931 годзе колькасьць рабочых і служачых ва ўсіх галінах нашай гаспадаркі ўзрасьце на 2 з лішнім мільёны. Адзначу, што і ў папярэднім годзе ў нашы прадпрыемствы ўліліся таксама каля 2 мільёнаў новых рабочых і служачых. Такі тэмп росту так званай наёмнай працы (прыходзіцца, нажаль, яшчэ ўжываць такія словы, як «наёмная праца», як гэта надта, мала адпавядае нашым сучасным умовам). Такі вялізарны і бязупынны прыліў новых рабочых і служачых патрабуе адпаведнага разгортваньня масавай арганізацыйнай і палітыка-выхаваўчай работы партыі, прафсаюзаў, кааперацыі і ўсіх дзяржаўных органаў. Недахопы тут у нас яшчэ вельмі вялікія, яны далі сябе адчуваць яшчэ ў мінулым годзе ў сувязі з узмацненьнем цякучасьці на прадпрыемствах. І ў 1931 годзе трэба абавязкова дабіцца лепшай арганізацыі ўсёй гэтай справы.

У сувязі з гэтым трэба рашуча паставіць пытаньне аб мэханізацыі. Справа мэханізацыі мае непасрэдныя адносіны да сельскай гаспадаркі, і да прамысловасьці, і да транспарту, і да будаўніцтва. Мэханізацыя ў апрацоўцы зямлі ўжо дала свае вялікія вынікі. У 1931 годзе мы ўводзім у сельскую гаспадарку новыя трактары, агульнай магутнасьцю да 1.200 тысяч конскіх сіл, і значна павялічваем колькасьць складаных уборачных сельска-гаспадарчых машын (камбайнаў, малатарняў). У чыгуначным транспарце вялікае значэньне для палепшаньня справы набывае пытаньне аб аўтасчэпцы. У будаўніцтве, асабліва на буйнейшых работах без усямернага разьвіцьця мэханізацыі работ мы не забясьпечым патрэбных нам тэмпаў. У пагрузачна-разгрузачных работах, на лесараспрацоўках і г. д. мэханізацыя таксама мае буйнейшае значэньне. Нарэшце, разьвіцьцё такіх галін прамысловасьці, як вугаль, торф, руда і г. д., у многіх выпадках проста ўпіраецца ў мэханізацыю. Таму прынятыя ў мінулую восень партыйныя і савецкія рашэньні ў адносінах вугальнай прамысловасьці Донбасу мелі вельмі важнае значэньне. Праўда, вытворчыя заданьні па вуглі ў Донбасе за мінулыя месяцы ня былі выканаюы поўнасьцю. Аднак, зусім ясна, што без вырашэньня пастаўленай ужо на 1931 г. у народна-гаспадарчым пляне задачы па мэханізацыі здабываньня вугалю ў Донбасе ня менш чым на 80 проц. нельга выканаць вытворчую праграму па вуглі, а яна павінна быць выканана абавязкова. Прыклад з Донбасам яскрава паказвае, што праблема мэханізацыі стала ў парадак дню, як адна з важнейшых умоў шпаркага далейшага ўздыму народнай гаспадаркі.

Сабекошт

Зьніжэньне сабекошту прадукцыі, а таксама будаўніцтва і перавозак, ня можа не стаяць у цэнтры нашых гаспадарчых задач. Забясьпечыць зьніжэньне сабекошту прамысловай прадукцыі па ВСНГ на 10 проц., па Наркамснабу на 11 проц. і па будаўніцтву на 12 проц.—вось заданьні на гэтым баявым вучастку трэцяга году пяцігодкі. Змагацца за выкананьне гэтых заданьняў, рашуча адхіляць усё, што гэтаму перашкаджае, і ствараць прадпасылкі для бязумоўнага выкананьня пляну, ня толькі ня зьніжаючы якасьці прадукцыі, а ўсямерна дабіваючыся яе палепшаньня, адзін з самых асноўных бальшавіцкіх абавязкаў гэтага году. Тым больш рашуча мы павінны весьці барацьбу за бязумоўнае выкананьне нашых задач на баявых вучастках гаспадарчага фронту, што ў першую чаргу ад гэтага будзе залежаць выкананьне асноўнай задачы: пяцігодка ў чатыры гады.

Аб дзяржапараце і аб недахопах гаспадарчай работы

Новыя задачы і барацьба з недахопамі плянаваньня

Трэба падкрэсьліць два асноўных недахопы ў нашай гаспадарчай рабоце: папершае, у галіне плянаваньня і, падругое, у галіне выкананьня. Апошняе асабліва важна. Пачну з недахопаў плянаваньня.

Паколькі сацыялістычны сэктар у народнай гаспадарцы заняў ужо яўна пануючую ролю, паколькі мы ўжо ўступілі ў пэрыяд сацыялізму,—пытаньне аб плянаваньні ўсёй нашай гаспадаркі набывае новае значэньне. Канкрэтна гэта можна паказаць на радзе прыкладаў, узятых з прапануемых на ваша зацьверджаньне кантрольных лічбаў на 1931 год. І сапраўды, нават у загаловак прадстаўленага на ваша вырашэньне першага пункту парадку дню ўнесена зьмена ў параўнаньні з мінулым годам. Раней гадовыя заданьні па народнай гаспадарцы мы называлі проста кантрольнымі лічбамі, зараз-жа называем народна-гаспадарчым плянам. Ужо адно гэта падкрэсьлівае рост элемэнтаў плянавасьці ў нашай народнай гаспадарцы ў цэлым. І сапраўды, зараз мэтады плянаваньня, якія ўжываліся ў прамысловасьці, мы ў поўнай і ўсё ўзрастаючай меры пераносім і на сельскую гаспадарку, што стала магчымым толькі дзякуючы буйнейшым посьпехам сацыялістычнай вытворчасьці сельскай гаспадаркі. Далей. Да гэтага году ЦВК зацьвярджаў толькі дзяржаўны бюджэт, а зараз на ваша зацьверджаньне прадстаўляецца апроч таго, фінансавы плян у цэлым. Гэта таксама паказальнік разьвіцьця плянавасьці ў нашым гаспадарчым жыцьці. Нарэшце, характарнай рысай народна-гаспадарчага пляну (кантрольных лічбаў) на 1931 год зьяўляецца наяўнасьць сапраўды буйных рэзэрваў як па бюджэту, так і па некаторых іншых артыкулах, у тым ліку наяўнасьць спэцыяльных рэзэрваў капітальнага будаўніцтва. Стварэньне рэзэрваў павялічвае прадпасылкі для правядзеньня сапраўды гібкага плянаваньня і, такім чынам, забясьпечвае магчымасьць неабходных гаспадарчых манэўраў у працягу году.

У сувязі з гэтым мы прад'яўляем зараз новыя патрабаваньні і апарату плянаваньня. Ранейшы апарат адыгрываў вялікую ролю ў сваёй галіне. Ва ўмовах-жа разгорнутай за апошнія гады ў краіне абвостранай клясавай барацьбы ўскрыліся аднак, з асаблівай сілай яго недахопы. Заключаліся гэтыя недахопы перш усяго ў тым, што ў органах плянаваньня была занадта малая адносная вага камуністычных кадраў, уладаючых марксысцкім мэтадам, і гаспадарчых работнікаў, прашоўшых дэталёвую практычную школу работы ў савецкіх умовах. Між тым без радыкальнага ўзмацненьня і аднаўленьня апарату плянаваньня за кошт новых элемэнтаў, за кошт камуністычных кадраў і сапраўды адданых рабочай клясе беспартыйных спэцыялістаў, і асабліва без прыцягненьня ў апарат плянаваньня значнага пласта маладых сіл, прашоўшых добрую практычную гаспадарчую школу і школу тэарэтычнай вучобы, нельга забясьпечыць патрэбныя ў сучасных умовах бальшавіцкія тэмпы і мэтады работы ў плянуючых органах. Факты выкрыцьця шкодніцкай работы, у тым ліку і органаў плянаваньня, дастаткова выразна гэта падкрэсьліваюць. Наша першачарговая неадкладная задача—па новаму зьверху да нізу разгарнуць работу апарату плянаваньня, аднавіўшы яго кадры, узмацніўшы яго партыйнымі сіламі і адданымі савецкаму ладу беспартыйнымі работнікамі.

У справе плянаваньня, як і ва ўсім сацыялістычным будаўніцтве вялізарную ролю адыгрывае ўдзел мас, у першую чаргу рабочых і калгасьнікаў. Прыклад ініцыятывы рабочых у арганізацыі прамфінплянаў на фабрыках і заводах, а таксама ў саўгасах і калгасах, зьяўляецца лепшым паказьнікам творчага ўздыму мільёнаў працоўных, будуючых сацыялізм. Толькі абапіраючыся на рабочых і на ўсю практычную работу нашых арганізацый, органы плянаваньня змогуць па сапраўднаму ўскрываць і ўжываць на справе ўсе канкрэтныя магчымасьці, якімі зможа карыстацца рабочая кляса, усё больш падвышаючы ў сваіх інтарэсах скарыстаньне ўнутраных рэсурсаў гаспадаркі. Як вядома, пытаньне аб адшуканьні гэтых унутраных рэсурсаў і лепшым скарыстаньні іх для інтарэсаў сацыялістычнага будаўніцтва мае для нас выключна важнае значэньне. Вядома, і ў справе плянаваньня, як і ў гаспадарчым кіраўніцтве, рашаючая роля застаецца за партыяй. Толькі дзякуючы ўмяшаньню партыі ў свой час быў выпраўлен рад буйнейшых недахопаў нашага плянаваньня, была адхілена не адна спроба шкоднікаў падарваць сацыялістычную гаспадарку. Узмацненьне і перабудова апарату, плянаваньне зьверху да нізу, пры апоры на ўзрастаючую актыўнасьць рабочых мас і нашых арганізацый, забясьпечаць нам новыя буйнейшыя посьпехі ў плянавым разьвіцьці сацыялістычнай гаспадаркі.

Аб праверцы выкананьня і змаганьні з бюракратызмам

Яшчэ большае значэньне мае зараз пытаньне аб недахопах выкананьня. У галіне фактычнага выкарыстаньня рашэньняў партыі і ўраду дзяржорганамі ў нас больш за ўсё недахопаў.

Таму пытаньне аб скарыстаньні падводзіць нас зараз да пытаньня аб рабоце дзяржапарату ў цэлым. Гэта ня вузка-практычнае пытаньне, гэта пытаньне вялікай палітычнай важнасьці. Задачы саветаў, задачы ўсяго дзяржапарату заключаюцца перш усяго ў ажыцьцяўленьні бальшавіцкіх тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Лінія партыі і лінія саветаў—адна лінія. Неабходна на практыцы забясьпечыць максымальнае адзінства работы партыі і саветаў, неабходна зьнішчыць меўшыя месца ў гэтай галіне недахопы, неабходна, каб дзяржорганы на справе праводзілі бальшавіцкую лінію змагаючыся супроць усіх права і «лева» апартуністычных яе скажэньняў. Асабліва трэба ўдарыць па правым апартунізме ў практыцы савецкай работы бо правы апартунізм становіць сабой найбольш яскравы і ў даных умовах найбольш небясьпечны выказьнік буржуазна-кулацкага ўплыву на нашы рады, калі ў даны пэрыяд работу саветаў вызначае прынятая партыяй і савецкай уладай лінія разгорнутага сацыялістычнага наступленьня супроць капіталістычных элемэнтаў. Ажыцьцяўленьне гэтай палітыкі наступленьня па ўсім фронце сустракае шалёнае супраціўленьне рэшткаў капіталізму—кулакоў і нэпманаў, буржуазнай інтэлігенцыі—супраціўленьне іх на розных вучастках нашай работы і пры тым у самых разнастайных формах. Арганізаваць адпор супраціўленьню нашых клясавых ворагаў і разгарнуць пад ленінскім сьцягам партыі такую барацьбу, якая-б забясьпечыла пераможнае разгортваньне сацыялістычнага наступленьня—вось асноўная палітычная задача саветаў. Тым больш пасьпяхова саветы будуць праводзіць гэту лінію, тым вышэй узьнімецца роля саветаў у сацыялістычным будаўніцтве. Узьняць ролю саветаў у правядзеньні бальшавіцкай лініі на практыцы—адна з важнейшых задач сучаснага моманту.

Усё гэта патрабуе ўзмацненьня барацьбы з клясава-чужымі ўплывамі ў дзяржапараце. Чыстка дзяржорганаў ад клясава-варожых элемэнтаў была неабходна, ад гэтага мы ня можам адмовіцца і ўперад. Аднак барацьба з чужымі пралетарыяту клясавымі ўплывамі ў дзяржапараце ня зводзіцца толькі да чысткі,—гэта значна больш складаная задача. Для таго, каб на справе разгарнуць барацьбу з чужымі пралетарыяту ўплывамі, неабходна ўзмацніць работу па трох напрамках: а) па бязьлітасным і бязумоўным выкарчоўваньні шкодніцтва і ў часткі іншых контр-рэвалюцыйных выпадаў нашых ворагаў; б) па барацьбе з бюракратызмам разам з усімі яго «дадаткамі»—валакітай, фармальна—непатрэбных адносінах да справы ў адкрытым месцы і па барацьбе з апартунізмам ва ўсіх яго разнастайных відах.

Аб неабходнасьці ўзмацненьня барацьбы з контр-рэвалюцыйным шкодніцтвам у дзяржапараце ці трэба гаварыць. Факты апошняга пэрыяду настолькі паказальны і адначасова настолькі шырока вядомы, што павінны спрыяць узьняцьцю клясавай пільнасьці нашых кіруючых кадраў дзяржорганаў і ўзмацненьню арганізаванага ўдзелу рабочых у барацьбе з такога роду зьявамі. Шахцінская справа аказалася яшчэ недастатковай для таго, каб узварушыць некаторых нашых работнікаў. Трэба думаць, што працэс «прампартыі», даныя аб шкодніцтве кулацка-эсэраўскіх ідэалёгаў тыпу Кандрацьцева, Чаянава і меншавіцкіх лідэраў тыпу Громана-Суханава, дзейнічаючых разам з прампартыяй, зьявяцца дастатковым штуршком да таго, каб па сапраўднаму забясьпечыць справу барацьбы з усімі і ўсялякімі спробамі контр-рэвалюцыйных шкоднікаў падарваць нашу работу. Вядомыя ўсім факты шкодніцтва ў галіне забесьпячэньня з асаблівай вастрасьцю пакрэсьлілі і асноўныя недахопы нашага апарату. Каб ня было таго бюракратызму ў органах забесьпячэньня і кааперацыі, прыклады якога так добра ўсім вядомы, шкоднікі не маглі-б зрабіць нам раду адчувальных удараў у справе забесьпячэньня. У нас досыць прыкладаў таго, як бюракратычныя спосабы работы дзяржорганаў палегчалі шкоднікам правядзеньне некаторых злачынных плянаў. Усё гэта гаворыць за тое, што пытаньне аб узмацненьні барацьбы з бюракратызмам набыло зараз актуальнейшае значэньне. Гэтую барацьбу мы вядзем ужо ня першы год і бязумоўна дамагліся некаторых вынікаў. Аднак, дасягнутае ня можа нас здаволіць. Ленін навучаў таму, што барацьба з бюракратызмам—справа сур'ёзная і вельмі значная. Да справы барацьбы з бюракратызмам у дзяржорганах мы будзем падыходзіць ня раз, новым і новым спосабам змагаючыся за гэту справу. Пры гэтым трэба памятаць, што па сапраўднаму барацьбу з бюракратызмам можна разгарнуць і на падставе сапраўднага і шырокага ўцягненьня рабоча-сялянскіх мас у кіраваньне. Ніхто ня можа адхіляць таго, што ў гэтых адносінах мы маем ужо буйныя посьпехі. Але гэтыя посьпехі яшчэ зусім недастатковыя. Узмацненьне барацьбы з бюракратызмам асабліва зараз дыктуецца нам усёй абстаноўкай. Гаспадарчыя задачы 1931 году настолькі вялізарныя, што ажыцьцяўленьне іх магчыма толькі пры ўмове, калі ўвесь наш кіруючы апарат будзе працаваць значна лепш, г. зн. калі барацьба з бюракратычнымі скажэньнямі ў дзяржапараце будзе ўзмоцнена. Важнейшым мэтадам барацьбы з бюракратызмам павінна стаць праверка фактычнага выкананьня. На падставе праверкі фактычнага выкананьня мы павінны дамагацца ад дзяржапарату рашучага павароту ад рознага роду фармальна-чыноўніцкіх мэтадаў работы да жывой практычнай справы. Узьняць справу выкананьня—гэта азначае перш за ўсё шчыльна заняцца сапраўды жывой справай, заняцца сапраўдным змаганьнем з бюракратызмам. Усё гэта патрабуе ўзмацненьня на справе змаганьня з апартунізмам у практыцы савецкай работы.

Нельга забываць таксама, што характарнейшай рысай апартунізму зьяўляюцца прымірэнчыя адносіны да бюракратызму і дробна-буржуазная пасыўнасьць у пытаньнях змаганьня з контр-рэвалюцыйным шкодніцтвам. Узмацненьне змаганьня з апартуністычнымі скажэньнямі вымагае ў даных умовах асаблівай настойлівасьці ў справе змаганьня з правым апартунізмам у кіруючых органах саветаў. Неабходнасьць узмацненьня змаганьня з недахопамі дзяржаўных, у тым ліку і ў гаспадарчых органах патрабавала ад ураду прыняцьця спэцыяльных мер.

Я спынюся толькі на аднэй з апошніх пастаноў Саюзнага ЦВК і СНК—на арганізацыі камісіі выкананьня пры СНК. Матывы ўтварэньня камісіі выкананьня зазначаны ў дэкрэце; ЦВК і СНК Саюзу кіраваліся пры прыняцьці гэтай пастановы паказаньнем Леніна аб тым, каб «цэнтр вагі перанесьці на падбор людзей, на праверку фактычнага выкананьня». Ленін многа разоў зазначаў, што справа фактычнай праверкі выкананьня мае важнейшае значэньне для работы дзяржорганаў. Ленін ня раз падкрэсьліваў, што пры правільнай, праверанай рэвалюцыйным вопытам палітыцы, цэнтр вагі практычнай работы павінен быць згрупаваны на праверцы выкананьня. Штодзень змагацца з бюракратычнымі скажэньнямі ва ўстановах, не допушчаць падмены жывой справы намнажэньнем папяровых пастаноў, правяраць на справе работу спэцыялістаў і ўсяго апарату і самому па сутнасьці аўладаць даручанай справай—у гэтым цяпер і заключаецца вялікі абавязак кіраўніцтва ў дзяржаўным апараце. У гэтых адносінах камісія выкананьня павінна адыграць буйнейшую ролю.

Відавочна, што органы ўзьнікнуць пры Саўнаркомах саюзных і аўтаномных рэспублік, а таксама пры райвыканкомах. Асноўным органам, на які будзе абапірацца камісія выкананьня, будзе РСІ. Роля РСІ ў справе змаганьня з бюракратызмам і ва ўсёй справе змаганьня з недахопамі работы дзяржорганаў зараз ня толькі не зьменшаецца, але наадварот, павінна значна ўзрасьці. Камісія выкананьня павінна забясьпечыць яшчэ больш цесную сувязь работы РСІ з усёй работай СНК і Савету Працы і Абароны. Удзел у камісіі выкананьня прадстаўнікоў ЦК УсеКП(б), а таксама ўсе ЦСПС і Калгасцэнтру яшчэ больш зьвяжа работу РСІ з работай партыйных, прафэсыянальных і калгасных арганізацый. Дзякуючы гэтаму жывое кіраўніцтва работай дзяржаўных, гаспадарчых і іншых органаў павінна значна ўзьняцца і гэтым самым можна будзе дамагчыся ўзмацненьня дысцыпліны ў савецкім апараце па ўсёй лініі. На праверцы выкананьня мы павінны зараз завастрыць увагу ўсіх нашых устаноў і арганізацый. Для таго, каб больш канкрэтна вызначыць задачы камісіі выкананьня, я падам некалькі прыкладаў.

Сапраўды, якімі прыкладна пытаньнямі камісія выкананьня павінна заняцца ў бліжэйшы час? Вось першы прыклад. Аднэй з важнейшых дырэктыў партыі і савецкай улады за апошні пэрыяд была пастанова аб стварэньні другой мэталюргічнай базы, пастанова аб арганізацыі мэталюргічнай базы на Урала-Кузьнецкім раёне. Відавочна, што выкананьне гэтай вялізарнай задачы справа ня лёгкая. Відавочна таксама, што патрэбны пільны кантроль за выкананьнем прынятых па гэтым пытаньні пастаноў. Нельга, нажаль, сумнявацца і ў тым, што для хуткага прасоўваньня справы арганізацыі новай мэталюргічнай базы трэба будзе перамагчы ня мала бюракратычных перашкод у рабоце нашых устаноў. Трэба думаць, што работа камісіі выкананьня па праверцы таго, як праводзіцца пастанова аб стварэньні новай мэталюргічнай базы на Ўсходзе, будзе мець ня малае значэньне. Другім прыкладам магла-б быць такая справа, як выраб запасных частак для трактараў і іншых сельска-гаспадарчых машын. У сувязі з набліжэньнем веснавой пасеўнай кампаніі гэта пытаньне вельмі актуальнае. Вядома таксама, што з вырабам запасных частак у мінулым годзе справа абстаяла надзвычайна дрэнна. Зараз ужываньне трактараў у нашай сельскай гаспадарцы шпарка расьце, уводзяцца тысячы камбайнаў і г. д. Трэба дамагчыся, каб нашы трактары і камбайны не стаялі бяз руху ў патрэбны момант, як гэта нярэдка ў нас бывае, асабліва з-за адсутнасьці неабходных запасных частак. Трэба таксама дамагчыся лепшых, больш беражлівых і ўважлівых адносін да машыны. Са злачынна-нядбайнымі адносінамі да трактараў, камбайнаў і малатарняў час рашуча скончыць. Праверка ўсёй арганізацыі запасных частак для трактараў павінна, мне здаецца, стаяць у ліку бліжэйшых задач камісіі выкананьня. Работа камісіі выкананьня можа тут мець вялікае значэньне як для веснавой пасеўнай, так і для наступнай уборачнай кампаніі.

Яшчэ адзін прыклад. У 1931 годзе мы ўкладаем у рабочае жыльлёвае будаўніцтва звыш 1 мільярду рублёў, атрымліваючы адпаведныя асыгнаваньні, у параўнаньні з мінулым годам, больш чым у два разы. Чаму-б па сапраўднаму не праверыць, як ідзе справа жыльлёвага будаўніцтва для рабочых, чаму-б не дамагчыся ў гэтай галіне большага парадку і большай увагі да патрэбных работ? Аб'яднаньне работы РСІ з работай прафэсыянальных арганізацый затое ў справе можа мець вельмі вялікае значэньне.

А колькі яшчэ такіх практычных задач, у адносінах якіх маецца дастатковая колькасьць пастаноў, але назіраецца зусім недастатковая ўвага да праверкі выкананьня гэтых пастаноў? Няма чаго даказваць, што ў камісіі выкананьня непачаты край работы. Узмацненьне ўвагі да задач выкананьня павінна з усёй вастратой паставіць праблему аб рабоце камуністаў—кіраўнікоў дзяржорганаў. Ня рэдка тут і камуністы аказваюцца не на вышыні задач змаганьня з бюракратычнымі скажэньнямі ў дзяржапараце. Нажаль, у нас ёсьць яшчэ і такія работнікі, якія толькі па назьве зьяўляюцца кіраўнікамі сваёй справы, але ня ўнікаюць па сапраўднаму ў сутнасьць сваёй работы. Між тым, зараз, прыклад абвастрэньня клясавай барацьбы ў пэрыяд, калі клясавы вораг гатоў на ўсякія мэтады барацьбы, прытым барацьбы для зрыву нашага будаўніцтва, з такім становішчам мірыцца ніякім чынам нельга. Нельга мірыцца з такімі фактамі, калі камуніст-кіраўнік, прапрацаваўшы доўгі час на адказнай пасадзе, ня імкнецца аўладаць справаю, ня ўнікае сам у сутнасьць сваёй работы і таму на справе зьяўляецца бездапаможным да праверкі работы буржуазных спэцыялістаў і наогул да праверкі работы ўсяго апарату. Асабліва зараз трэба павесьці барацьбу з бюракратычнымі спасабамі работы, фармальным санкцыяваньнем работы другіх людзей, нярэдка да таго-ж прышоўшых з чужога рабочай клясе асяродку, павесьці барацьбу з нежаданьнем упартай работай над сабой дамагчыся аўладаньня даручаных партыяй і савецкай уладай дырэктыў.

Націск, які мы робім зараз на праверцы фактычнага выкананьня, дапаможа нам разгарнуць барацьбу з недапушчальнымі зьявамі. За апошнія два гады мы дамагліся рашучага зруху ў пытаньні аб падрыхтоўцы пралетарскіх кадраў для ўсіх галін сацыялістычнага будаўніцтва. Бяз гэтага мы не маглі-б забясьпечыць неабходным кіраўніцтвам розныя галіны сацбудаўніцтва. Тысячы і дзесяткі тысяч новых спэцыялістаў, якія штогод уліваюцца ў нашу гаспадарку, дадуць нам асноўныя кадры кіраўнікоў гаспадарчым будаўніцтвам і іншымі галінамі кіраўніцтва. Вялікае значэньне мае таксама прыцягненьне чужаземных спэцыялістаў, асабліва з навуковым вопытам. Удзел чужаземных спэцыялістаў у нашым будаўніцтве даў нам ужо нямала карысьці. Рабочыя СССР ня могуць служыць прыкладам тым работнікам-чужаземцам, якія цэняць і актыўна ўдзельнічаюць у нашым гаспадарчым будаўніцтве. Аднак, поруч з гэтым мы маем таксама прыклады кепскай работы і недапушчальных паводзін паасобных чужаземных спэцыялістаў.

Справа кіраўніцтва гіганцкі ўзрастаючым гаспадарчым будаўніцтвам зьвязана з вялікімі труднасьцямі. Таму ад кіраўнікоў гэтаю справаю як ад камуністаў, так і беспартыйных работнікаў, мы павінны патрабаваць упартай работы над сабой, над даручанай справай. Таму ад камуністычных кіраўнікоў нашых устаноў патрабуецца, каб яны ўмелі арганізоўваць узрастаючую актыўнасьць сярод рабочых і накіроўваць на вырашэньне важнейшых задач.

Разгортваньне культурнага будаўніцтва стварае новыя спрыяючыя прадпасылкі для далейшага ўздыму культурнага ўзроўню рабочых і сялянскіх мас. Гэта, у сваю чаргу, забясьпечвае ў далейшым больш буйныя тэмпы будаўніцтва сацыялізму. У справе пашырэньня матар'яльнай базы культурнага будаўніцтва мы ў 1931 г. зробім новы трудны крок наперад, 6,5 мільярдаў рублёў накіроўваецца па лініі фінансаваньня культурнага будаўніцтва і падрыхтоўкі кадраў. Адначасова з ростам гаспадарчага будаўніцтва і ўцягненьня ўсё новых мільёнаў працоўных у справу будаўніцтва сацыялізму расьце новая, сацыялістычная культура. Выкананьне задач народна-гаспадарчага пляну на 1931 г. будзе вялікім крокам наперад у разьвіцьці сацыялістычнай культуры ў нашай краіне ў усіх шматстайных нацыянальных формах гэтай культуры.

(Працяг будзе).

*) Працяг. Пачатак глядзі «Сав. Бел.» ад 8-І-31 г. № 6 (3095).

„Тыдзень Савецкай Беларусі“ ў Маскве

Толькі пад кіраўніцтвам КП(б)Б на аснове правільнай ленінскай нацпалітыкі, шырокім падтрыманьні пралетарыяту іншых братэрскіх рэспублік СССР—БССР магла дабіцца вялізарных дасягненьняў на фронце сацыялістычнага будаўніцтва

МАСКВА, 7-І. 6-га студзеня ў дзелавым клюбе адбыўся вечар змычкі гаспадарнікаў БССР і Масквы. Геаграфічнае становішча Савецкай Беларусі зазначыў у прывітаньні намесьнік старшыні праўленьня дзелавога клюбу тав. Каловіч, патрабуе максымальна шпаркіх тэмпаў у разьвіцьці індустрыі. Гаспадарнікі Масквы аддадуць усе сілы на тое, каб праз сыстэматычную сувязь з гаспадарнікамі БССР шляхам шырокага абмену вопытам і тэхнічнымі дасягненьнямі ўсяляк дапамагаць далейшаму росту і ўзмацненьню прамысловасьці братэрскай рэспублікі—БССР. Намесьнік старшыні ВСНГ БССР Стракоўскі ў кароткім дакладзе яскрава намаляваў вялізарныя дасягненьні прамысловасьці Савецкай Беларусі. Толькі пад кіраўніцтвам КП(б)Б на аснове правільнай ленінскай нацыянальнай палітыкі, шырокім падтрыманьні пралетарыяту іншых братэрскіх рэспублік вялікага Савецкага Саюзу—БССР магла дабіцца вялізарных дасягненьняў на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва. Народная гаспадарка БССР і асноўнае—індустрыя расьце, мацнее. БССР зусім уяўляе сваю вялізарную адказнасьць, вызначаную геаграфічным разьмяшчэньнем сваёй тэрыторыі. Яна заўсёды гатова прыняць і як сьлед адбіць першыя ўдары вайсковага нападу, калі толькі міжнародная буржуазія адважыцца на такую авантуру.

Прадстаўнікі раду маскоўскіх прадпрыемстваў расказалі беларускім госьцям аб сваіх дасягненьнях. Ад імя пралетараў Масквы яны абяцалі пралетарыяту БССР братэрскае падтрыманьне і дапамогу, накіраваную ў інтарэсах далейшага росквіту Савецкай Беларусі.

Урачыстае пасяджэньне Камунівэрсытэту нацменшасьцяй Захаду было адзначана выступленьнем Наркамасьветы БССР т. Платуна, які падрабязна высьвятліў рост культурнага жыцьця БССР. 80 проц. няпісьменных у царскі час і ніводнага няпісьменнага да канца 1931 году. Ніводнага ВНУ ў даваенны час, 16 ВНУ, 7.000 студэнтаў у сучасны момант. Каля паўтара мільёна вучняў, вялікі тыраж нацыянальных газэт, кніжак, сотні клюбаў, кіна-тэатраў—вось культурны актыў БССР.

На працягу гэтых некалькіх дзён, сказаў тав. Платун, хоць часткова мы маглі пазнаёміць маскоўскі пралетарыят з тымі дасягненьнямі ў будаўніцтве прамысловасьці, культуры, якіх дасягнула БССР, дзякуючы савецкай уладзе, кіраўніцтву камуністычнай партыі.

З прывітаньнямі выступалі рабочыя ўдарнікі беларускіх заводаў і калгасаў. З вялікай увагай прысутныя заслухалі прывітаньне 60 гадовай работніцы—ударніцы фабрыкі «Дзьвіна», члена ЦВК БССР—тав. Мікалаевай. Работніца-ўдарніца тав. Галянда прачытала рапарт аб дасягненьнях краўецкай фабрыкі «Прафінтэрн», якая зьяўляецца першай па велічыні ў СССР.

Зьлёт маскоўскіх ударнікаў, які адбудзецца ў Калённай Залі Дому Саюзаў сумесна з беларускімі ўдарнікамі, паслаў ЦК КП(б)Б прывітальную тэлеграму наступнага зьместу:

«Сход ударнікаў Масквы пасылае бальшавіцкае прывітаньне ЦК КП(б)Б, правадыру і арганізатару сацыялістычнага будаўніцтва БССР. Рабочыя Масквы са здавальненьнем адзначаюць аграмадны гаспадарчы культурна-палітычны рост Савецкай Беларусі, правільнае вырашэньне нацыянальнай палітыкі на аснове правядзеньня генэральнай лініі нашай партыі і барацьбы з усякімі праявамі апартунізму, рашучай барацьбы супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, нацыянал-апартунізму, контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму і шавінізму ўсіх колераў. Ударнікі пралетарскай сталіцы ўпэўнены, што ЦК КП(б)Б і надалей будзе весьці незамірымую барацьбу з ухіламі ад генэральнай лініі партыі, у асаблівасьці з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, контр-рэвалюцыйным трацкізмам, права-«левацкім» блёкам, двурушніцтвам, якія перашкаджаюць будаваць сацыялізм у СССР. Ударнікі Масквы, адзначаючы бурны рост прамысловасьці, калектывізацыі сельскай гаспадаркі СССР, пасылаюць сваё братэрскае прывітаньне рабочым і працоўнаму сялянству Заходняй Беларусі, якія пакутуюць пад уціскам польскага фашызму.

Няхай жыве КП(б)Б—адзін з лепшых атрадаў жалезнай УсеКП(б)!

Няхай жыве выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады!».

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Агонь па праявах правага і „левага“ апартунізму ў перавыбарчай кампаніі

„Перабудова работы саветаў можа адбыцца толькі на аснове ўзьняцьця ролі саветаў, як праваднікоў генэральнай лініі партыі, няпрымірыма варожай як у адносінах правага, так і ў адносінах „левага“ апартунізму“.
(З рэзалюцыі аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б).

На хвалях праваапартуністычнага самацёку

Па-бальшэвіцку выправіць памылкі, перабудаваць работу саветаў—праваднікоў генэральнай лініі партыі

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Сход у хаце чытальні ІІ-га Грудзінаўскага сельсавету назначаны быў на 10 гадзін раніцы. Было ўжо 12 гадзін дню, а ўпаўнаважаная РВК т. Бараноўская ўсё зьбіралася.

— Як далёка гэты сельсавет адгэтуль?—пытаю я.

—Кілёмэтраў 12 будзе,—адказвае ўпаўнаважаны.

У поўдня мы нарэшце выбраліся. Калі я толькі хваляваўся за такія адносіны ўпаўнаважаных да перавыбараў і маўчаў, дык выбаршчыкі, якія былі ў зборы, проста казалі:

— Гэта зьдзекі над намі.

Кулацтва пад крылышкам апартуністычнага кіраўніцтва сельсавету

Перавыбарчая кампанія саветаў павінна стаць важнейшым сродкам карэннай перабудовы ўсёй работы саветаў у адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага пэрыоду і ўзьняцьця ролі саветаў у правядзеньні генэральнай лініі партыі. Гэтым павінна была-б быць прасякнута справаздача ІІ-га Грудзінаўскага сельсавету. На самай-жа справе справаздача ІІ-га Грудзінаўскага сельсавету ня мела ніякага палітычнага зьместу.

Намесьнік старшыні, (апошнія месяцы старшыня сельсавету), член партыі тав. Дамсон гаворыць у сваёй справаздачы ўсё... акрамя таго, што трэба было сказаць на аснове рашэньняў партыі і ўраду аб рабоце саветаў ва ўмовах сацыялістычнае перабудовы вёскі, ва ўмовах абвастранейшай клясавай барацьбы. Тав. Дамсон гаворыць: «індывідуальна абкладзеных у нас няма, праўда, ёсьць толькі 4 гаспадаркі з процантнай надбаўкай». Больш таго, на гэтым-жа сходзе па справаздачы РВК Дамсон выступіла з такой праваапартуністычнай прамовай:—«нашаму сельсавету даюць непасільныя заданьні па розных загатоўках». Гэтым яна мела на ўвазе апраўдаць права-апартуністычную дзейнасьць ІІ-га Грудзінаўскага сельсавету. Аб гэтай непасільнасьці т. Дамсон гаворыць у той час, як ІІ-гі Грудзінаўскі сельсавет зьяўляецца ў асноўным заможным, дзе пяць кулацкіх гаспадарак было раскулачана.

У выніку гэтай права-апартуністычнай практыкі заданьне па загатоўках і ў прыватнасьці загатоўка ільна-валакна ня выканана.

Вось чаму па справаздачы сельсавету заможнай частцы няма чаго было выступаць, бо яны добра схаваны пад крылом права-апартуністычнай практыкі сельскага савету. Вось чаму яны толькі ў адзін голас падтрымлівалі Дамсон і гаварылі: «заданьне па загатоўках на наш сельсавет далі непасільнае».

Партячэйка і ІІ-гі Грудзінаўскі сельсавет недаацанілі працу з беднатой і занядбалі працу з жанчынамі. На запытаньне, чаму не праводзілася праца з жанчынамі, Дамсон адказвае: «два сходы правялі, а сыстэматычна не працавалі таму, што адказныя працаўнікі сельсавету былі заняты адказнай працай».

Работа з жанчынамі па іхнаму не зьяўляецца адказнай работай.

Аб калектывізацыі ў дакладзе сказана:

— Быў калгас, але развалюўся.

Што прадпрыняў сельсавет, каб папярэдзіць развал калгасу, аб гэтым нічога ня сказана, ды і няма што казаць. Грудзінаўскі сельсавет быў далёка ад калектывізацыі, ён ня быў яго баявым штабам, не павярнуўся тварам да калгасаў.

Сакратар у лесе, старшыня паехаў...

Ля памяшканьня Куськавіцкага с-с некалькі дзядзькоў, а на дзьвярах сельсавету вялікі ад пуні замок. Гэта было а 12 гадзіне дню.

— Дзе-ж кіраўнікі?

— А хто яго ведае, мы таксама ўжо зранку чакаем. Схадзеце на дом да сакратара.

Дома ў сакратара сельсавету даведаўся, што сёньня ў вёсцы Сьлюдзюках маецца быць перавыбарчы сход і што сакратар сельсавету партыец—**Грыбач паехаў у лес.** Калі-ж прыедзе, невядома.

Прыехалі ў вёску Сьлюдзюкі. Старшыню сельсавету тав. **Аўтухова дома не засталі. Таксама паехаў кудысьці. Сакратар сельскага савету, ён-жа і сакратар парт'ячэйкі, у Сьлюдзюкі на перавыбары не зьявіўся. Старшыня сельсавету Аўтухоў ня прыехаў.**

Праваапартуністычная стаўка на самацёк

А 8-ай гадзіне ўвечары зьяўляецца нарэшце старшыня сельсавету і толькі тады даецца распараджэньне «заказаць на сход». Аб падрыхтаванасьці і забясьпечаньня 100-процантнай яўкі выбаршчыкаў гаварыць ня прыходзіцца. Такую «падрыхтаванасьць» можна кваліфікаваць толькі, як права-апартуністычную стаўку на самацёк у справаздачна-перавыбарчай кампаніі сельсавету.

Сакратар парт'ячэйкі не нашоў патрэбным удзельнічаць на перавыбарчым сходзе, не нашоў патрэбным сваячасова выехаць з раёну і ўпаўнаважны РВК. Толькі, а 8 гадзіне ўвечары спатыкаем ля школы сані. У іх упаўнаважаны РВК Зямцоў і начальніцкім тонам зьвяртаецца:

— Ну дзе-ж тут ваш сход?

Актыўнасьць выбаршчыкаў на справаздачных сходах у Куськавіцкім сельсавеце была шырока разгорнута. Крытыкавалі работу сельсавету, адзначалі, што старшыня сельсавету працаваў часта ў п'яным відзе, адсутнічала праца з жанчынамі, кульгала работа сярод беднаты. Не звярачваў сельсавет увагі на працу калгасу імя Варашылава, не займаўся працай арганізацыі новых калгасаў.

Да 7 сьнежня ня думалі аб перавыбарах

Раённая выбарчая камісія на першых часах недастаткова правярала падрыхтаванасьць сельскіх выбарчых камісій, не цікавілася падрыхтаванасьцю прафсаюзных арганізацый да перавыбараў сельскіх саветаў. Рад адказных работнікаў, мабілізаваных на перавыбарчую кампанію, працавалі з прахладцам, некаторыя-ж і зусім не выяжджалі з раёну.

Рад партыйных і камсамольскіх вясковых ячэяк (Баркалабаўская, Гарадзецкая) сустрэлі справаздачна-перавыбарчую кампанію не падрыхтаванымі. Клясаваму ворагу ня было дадзена рашучага адпору,—таму ў склад сельсаветаў пралезьлі клясава-варожыя нам людзі. Выбарчыя сходы ня былі забясьпечаны 100-процантнай яўкай за іх беднаты, калгасьнікаў і жанчын.

Парт'ячэйка саўгасу «Грудзінаўка» да 7-га сьнежня і ня думала аб перавыбарах і ніякай падрыхтоўчай працы не праводзіла. У 1-ым Грудзінаўскім сельсавеце нават адсутнічалі сьпісы выбаршчыкаў і сьпісы пазбаўленых голасу. Аб іх выбаршчыкі нявеалі.

Некаторыя парт'ячэйкі, ячэйкі ЛКСМ (Куськавіцкая, Глуская, Макранская, ІІ-ая Грудзінская, парткалектыў заводу «Ільліч») праваапартуністычна адносіліся да падрыхтоўкі батрацтва, беднаты і калгасьнікаў да правядзеньня першых справаздачна-перавыбарчых сходаў, дзякуючы чаму зусім недастаткова была разгорнута крытыка работы старога складу сельсавету. Ня ўнесена ніводная прапанова, дабаўка ў абгаворваньні наказу новым дэпутатам. Не даваўся рашучы адпор клясава-варожаму элементу (Ліпаўка).

Былы бандыт, клясавыя ворагі пралезьлі ў саветы

Апошні аб'яднаны Пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) у сваёй рэзалюцыі аб перавыбарах у саветы даў дакладную і выразную дырэктыву:

«Перавыбары сельсаветаў павінны ўнесьці карэнныя палепшаньні ў самы склад саветаў. Першае месца ў саветах павінна належыць лепшым ударнікам—у рабочых цэнтрах, перадавым калгасьнікам—у вёсцы, як партыйным, так і беспартыйным». Але гэтая ўстаноўка ў радзе мейсц Быхаўскага р-ну ня толькі ня выконвалася, але злачынна скажалася.

У новым складзе Глускага сельсавету адсутнічалі жанчыны і бедняні. У Глуха-Селінскім вучастку гэтага-ж сельсав. у склад дэпутатаў быў абраны былы бандыт Навіцкі. Старшынёй гэтага с-с быў абраны расстратчык, які знаходзіўся пад судом.

У склад Баркалабаўскага сельсавету быў абраны варожы нам элемэнт, які знаходзіцца пад судом за зрыў мерапрыемстваў партыі і савецкай улады па зямляўпарадкаваньні. У гэтым-жа с-с са справаздачна - перавыбарчага сходу ня выдалілі кулака.

Прымірэнцтва да праяў правага апартунізму

Гэтыя праявы правага апартунізму на практыцы ў правядзеньні першых справаздачна - перавыбарчых сходаў Райком партыі палітычна недаацаніў, аднесься да іх прымірэнча, кваліфікуючы іх толькі як «шэраг буйных прарываў».

Пасьля зьмяшчэньня ў газэце «Савецкая Беларусь» артыкулу «аб праваапартуністычнай практыцы ў перавыбарчых сходах на Быхаўшчыне» РК перагледзіў сваю ранейшую палітычна-блізарукую ацэнку ходу перавыбарчай кампаніі і зрабіў шэраг арганізацыйных вывадаў.

Раённая выбарчая камісія па 6-7 выбарчых вучастках выбары адмяніла.

Раённая газэта «Маяк Камуны» на працягу ўсёй перавыбарчай кампаніі, акрамя апавяшчэньня старту, зьмясьціла толькі адзін маленькі допіс аб Савецкай эстафэце.

Газэта ўсьлед за Райкомам кваліфікавала праявы правага апартунізму, меўшыя месца ў перавыбарчай кампаніі, толькі як «буйныя прарывы». Газэта прымірэнча аднеслася да яскравых праяў правага апартунізму і не падняла гэтыя праявы на прынцыповую вышыню, не мабілізавала партарганізацыю і працоўных раёну на барацьбу за генэральную лінію партыі, на барацьбу супроць ухілаў ад яе.

Сыгналы „Савецкай Беларусі“, пачуты

Папярэднія вынікі перавыбараў саветаў па Быхаўскім раёне паказваюць, што сыгналы аб меўшайся права-апартуністычнай стаўцы ў перавыбарах саветаў, дайшлі да месца. Ужо справаздачна-перавыбарчыя сходы другой і трэцяй чаргі па радзе выбарчых вучасткаў адзначаюцца большай актыўнасьцю беднякоў, калгасьнікаў і сераднякоў, як у сэнсе яўкі на выбарчыя сходы, так і ў сэнсе ўдзелу ў абгаварэньні імі работы сельсавету.

На буйных выбарчых вучастках вялікую ролю адыгралі аднадзённыя дзіцячыя яслі, якія былі арганізаваны ў дзень перавыбараў за кошт грамадзкіх, каапэрацыйных і прафсаюзных арганізацый.

Так, на перавыбарчым сходзе Тошыцкага сельсавету яўка выбаршчыкаў складае 72,3 проц., жанчын—52 проц. З 30 абраных дэпутатаў—7 жанчын абраны ў члены сельсавету, 4 у кандыдаты.

Па Тайманаўскім сельсавеце процант яўкі на справаздачна-выбарчы сход складае 75-80 проц. Уся справаздача ўвязвалася з задачамі выкананьня палітычна-гаспадарчых кампаній, з задачамі сацыялістычнага будаўніцтва.

На справаздачна-перавыбарчы сход па Салец-Халапейскім сельсавеце зьявілася 71,33 проц. Абрана ў склад сельсавету 7 жанчын, што складае 33 проц. да агульнага ліку дэпутатаў. Трэба адзначыць актыўнасьць на перавыбарчым сходзе і кулацкіх выступленьняў, але бедната і калгасьнікі пад кіраўніцтвам **парт'ячэек давалі ім рашучы адпор.**

Лічбы ўдзелу і выбараў у новы склад сельсаветаў па 10 саветах, па якіх скончаны выбары, усё-ж такі ня зусім здавальняючыя. 100-процантная яўка на выбарчых сходах не дасягнута. Агульны ўдзел выбаршчыкаў складае 83,47 проц.

Жанчын удзельнічала на выбарах па 10 саветах 43,97 проц. да агульнага ліку жанчын выбаршчыц. Абрана жанчын у склад саветаў 24,54 проц., 38,64 проц. дэпутатаў аслабанёных ад сельска-гаспадарчага падатку. У склад сельсаветаў прайшло толькі 70 проц. кандыдатур, абгавораных сходамі беднаты і жанчын.

Савецкая эстафэта „Савецкай Беларусі“

Ініцыятыву газэты «Савецкая Беларусь» аб правядзеньні савецкай эстафэты Быхаўскі раён падхапіў адным з першых. Праз сваю раённую газэту **«Маяк камуны»** дадзены досыць багаты па зьместу старт—савецкай эстафэты. Былі складзены брыгады рабочых-чыгуначнікаў, будаўнікоў, рабочых саўгасу «Лучыцы». Але гэта было толькі добрым пачаткам.

3-4 брыгады выяжджалі ў сельсаветы. Але ні парт'ячэйкі, ні штаб эстафэты не забясьпечылі кіраўніцтвам арганізаваных брыгад па правядзеньні Савецкай эстафэты.

Парт'ячэйкі на мясцох ня ўключыліся ў правядзеньне савецкай эстафэты, не дапамагалі брыгадам.

Аб брыгадах, прадстаўніках, плякатах

Цэнтральная выбарчая камісія паслала ў Быхаў брыгаду для абсьледаваньня ходу перавыбарчай кампаніі. Кіраўнік гэтай брыгады тав. Мікуліч прабыўшы ў Быхаве 5 гадзін, паехаў назад у Менск. Каму патрэбна такое гастралёрства і што карысьці з яго раёну?

Другое, што кідаецца ў вочы,—гэта несвоечасовая дастаўка ў раён прыстасаваных да перавыбарчай кампаніі плякатаў і лёзунгаў.

Плякаты ў Быхаўскім раёне атрыманы толькі 2-І—31 г., т. зн. калі скончылі перавыбарчую кампанію:

Лёзунгі высланыя для раёнаў цэнтральнай выбарчай камісіяй яшчэ і сёньня да раёну не дайшлі.

***

Перад раённай партарганізацыяй Быхаўшчыны паўстае баявая задача, па сапраўднаму выправіць маючыяся праваапартуністычныя прарывы, па бальшавіцку на грунце рашэньняў Сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) перабудаваць работу Саветаў, з тым, каб яны сталі сапраўднымі праваднікамі генэральнай лініі партыі, каб яны па сапраўднаму павярнуліся тварам да вытворчасьці, тварам да калгасу.

Цьвёрда памятаць, што «ў пэрыяд разгорнутага сацыялістычнага наступу партыя асабліва ня можа мірыцца з права-апартуністычнай практыкай у тыка) ня толькі ня забясьпечвае прыкіраўніцтве савворганамі, якая (пракнятых бальшавіцкіх тэмпаў будаўніцтва і пасьлядоўнай барацьбы з бюрократызмам на грунце разгорнутай пралетарскай самакрытыкі, але на справе адзначае сабаціраваньне, а зачастую і просты зрыў важнейшых дырэктыў партыі. Пагэтаму ў сучасных умовах ня можа быць месца правым апартуністым і беспрынцыповым прымірэнцам у кіруючых органах Саветаў».

А. Малевіч.

У хвасьце кампаніі

Чарэйская Раённая Выбарчая камісія не дала сельскім выбарчым камісіям практычных паказаньняў па перавыбарах. Упаўнаважаны быў высланы, калі парассылалі ўжо выбарчыя позвы і правялі перавыбары. У склад сельсавету трапілі чужыя нам элементы.

У некаторых сельсаветах раіліся кандыдатуры не ад ячэйкі КП(б)Б, а ад ячэйкі Мопру, ТДА-Авіяхэму, КСМ (Гілянскі, Замыцкі і інш. сельсаветы). Перавыбары сельсаветаў пачаліся, а райком КП(б)Б даведаўся пра гэта толькі праз тыдзень і сам сакратар райкому (?!) па 8 сельсаветах адмяніў перавыбары.

Чарэйскі р-н. **РАБОЧЫ.**

АД РЭДАКЦЫІ: Чакаем ад Райкому КП(б)Б тлумачэньняў па сутнасьці гэтага допісу. Як здарылася, што ячэйкі Мопр і інш. узяліся «замяняць» партыйныя ячэйкі. Як рэагаваў Райком на гэтыя выпадкі, якія зьяўляюцца па нашай думцы вынікам бязьдзейнасьці некаторых ячэек, іх праваапартуністычнай стаўкі на самацёк.

Пакончыць з праваапартуністычнай практыкай!

Перавыбары сельсаветаў па Слуцкім раёне праходзяць самацёкам. У многіх вёсках маем арыў перавыбарчых сходаў (в. Старцавічы, Сераднякоўскі с-с.).

У такіх сельсаветах, як **Амговіцкі, Малешкаўскі,** Казловіцкі процант яўкі на перавыбарчыя сходы ледзь перавысіў 50.

Маем такія сельсаветы, дзе не прайшоў у склад членаў сельсавету ніводзін камсамолец і партыец (Мялешкаўскі с-с). У Прошчыцкім сельсавеце ў склад с-с не прайшло ніводнага рабочага, батрака і калгасьніка, а аднаасобнікі складаюць 95,23 проц.

Агульны процант наведваньня сходаў жанчынамі не перавышае 35. Выбары іх у склад сельсавету мізэрныя (у Казлоўскім сельсавеце—15 проц., у Прошчыцкім—19 проц., у Бокшыцкім—таксама).

Такі слабы ўдзел у наведваньні перавыбарчых сходаў тлумачыцца тым, што амаль ніякай працы, асабліва сярод жанчын, не праводзілася.

Трэба пакончыць з праваапартуністычным самацёкам.

Я. П.

САНЛІВЫ СХОД

Ледзь не з 2-гадзінным спазьненьнем сабраліся выбаршчыкі на сход. З 150—прысутнічала 100.

З дзесятак зададзеных запытаньняў па справаздачы датычыліся выключна забесьпячэньня, і адно пытаньне прагучэла ў разрэз з агульнай санлівасьцю сходу:

— Што рабіў Гарсавет, каб забясьпечыць бесьперабойную падачу электраэнэргіі на прадпрыемствы?

Па справаздачы выказаліся толькі трое. Сьпыняліся прамоўцы на рабочым забесьпячэньні. Выступаўшы затым тав. Гулякевіч падкрэсьліў дасягнутыя вялікія посьпехі ў справе сац. будаўніцтва і выкананьня пяцігодкі за чатыры гады, што зьявілася магчымым толькі дзякуючы адзіна правільнаму кіраўніцтву нашай ленінскай партыі. Разам з тым прамоўца адзначыў, што **Гарсавет ня выканаў наказу аб адчыненьні дзіцячых пляцовак і яслях, не забясьпечыў акраін крамамі ЦРК.**

Прыняцьце ацэнкі дзейнасьці Гарсавету таксама як і наказу новаму складу перанесена на перавыбарчы сход.

Менск. **Г. Ш.**

Справаздачы сэкцый складзены па вестках.. са столі

У сучасным складзе Менскага Гарсавету ўсе члены, гарсавету прымацаваны да сэкцый, але належнага вучоту іх няма. У сьпісах членаў сэкцый поўная блытаніна, у рабоце — бясплянавасьць. Калі наша брыгада запыталася ў Гарсавеце аб актыве, дык выявілася, што пра гэты актыў ніхто ня ведае. Але пасьля двухгадзінных хаджэньняў з аднаго пакою ў другі, па канцылярыях Гарсавету брыгада знайшла «актыў».

Працаўнік Гарсавету паклаў перад намі цэлую гару картак-анкет на членаў Гарсавету.

— Вось, шукайце тут.

Пачаліся пошукі. Палова картак была перакрэсьлена — гэта выбыўшыя, на картках некаторых сэкцый напісаны характарыстыкі аб рабоце членаў сэкцый, на іншых картках — проста адзнакі аб праробленай рабоце, але значныя частка картак зусім чыстыя.

Па гэтых «вестках» прышлося ўстанаўляць хто з членаў Гарсавету актыўна ўдзельнічаў у рабоце сэкцый, але гэта аказалася ня зусім лёгкай справай. Узяць хоць-бы, напрыклад, каапэрацыйную сэкцыю. Са справаздачы гэтай сэкцыі і справаздачы гарсавету відаць, што за справаздачны пэрыод было праведзена 32 пасяджэньні пленуму сэкцый (хаця па рэгістрацыйных картках відаць адзнакі толькі па 22 пленумах), прычым усе гэтыя пленумы акуратна наведвалі толькі 5—6 членаў (паводле адзнак у картках), рэштка наведвалі сэкцыі выпадкова, а частка і зусім ні разу ня былі ні на адным пленуме. Між іншым усё гэта не перашкаджае ставіць у справаздачы сэкцый лічбы сярэдняга наведваньня пленумаў — 45-65 проц.

Прыблізна так і па іншых сэкцыях.

У сьпісах лічыцца шмат «мертвых душ», гэта члены сэкцый, якія або куды-небудзь выехалі, або не працуюць у сэкцыі, а былі выпадкі, што працуюць зусім у іншых сэкцыях (т. Цыпін, больш як паўтары гады працуе ў жыльлёва-будаўнічай сэкцыі, нават часам замяшчаў там старшыню, але ён лічыцца па сьпісках у адміністрацыйнай сэкцыі) і г. д.

Як відаць і ў справаздачах сэкцый значная частка вестак узята «са столі».

Усё гэта ўрэшце прыводзіла да таго, што і належнага кіраўніцтва сэкцыямі ня было, у выніку чаго сэкцыі працавалі слаба.

Гарсавет працаваў ня ведаючы нават складу сваіх членаў, апартуністычна паклаўшыся на поўны самацёк у гэтым напрамку.

Прыгада «С. Б.» М. і А.

Сэкцыя РСІ... на паперы,

Альбо аб „мёртвых душах“ і „очковтирательствах“ Гарсавету

«У склад сэкцыі 12 скліканьня было абрана членаў і кандыдатаў—76, а па застаючымся на сёньняшні дзень засталося—50 чалавек, астатнія выбылі. За справаздачны час адбылося 10 пасяджэньняў пленуму сэкцыі і 22 пасяджэньні бюро сэкцыі. Наведваньне па сяджэньняў сэкцыі даходзіла ад 55 да 60 проц.»,—чытаем мы ў справаздачы аб рабоце сэкцыі РСІ Менгарсавету за пэрыяд красавік 1929 г.—сьнежань 1930 г. Ніжэй падрабязна пералічваюцца дасягненьні сэкцыі за справаздачны час. Ёсьць, праўда, тут і спасыланьні на перашкоды ў рабоце «аб'ектыўнага» характару, якія гавораць аб тым, што «на рабоце сэкцыі значна адбілася адсутнасьць кіраваньня з боку Акр. РСІ, якая ня ўдзяляла належнай увагі рабоце сэкцыі, не ўдала магла ўцягваць членаў сэкцыі ў практычную работу...».

Паглядзім ці адпавядаюць дасягненьні сэкцыі і «аб'ектыўнасьць» перашкод у рабоце сэкцыі РСІ з сапраўднай яе дзейнасьцю. Факты, выкрытыя брыгадай газэты **«Савецкая Беларусь»** кажуць аб адваротным.

У справах агульнай канцылярыі гарсавету парадкам складзены, паперкай перакладзены і шнурком перавязаны дзьве кулькі асабовых картак членаў сэкцыі РСІ. На гэтых картках відаць, што ў склад сэкцыі ўваходзіла—132 чал., з іх 52, прымаўшых некаторы ўдзел у рабоце сэкцыі і 80 чалавек—«мёртвых душ», якія зусім ня прымалі ніякага ўдзелу ў рабоце сэкцыі. У той час, як па справаздачы сэкцыі відаць, што актыўна ўдзельнічала на пленумах сэкцыі да 60 проц. членаў, па адзнаках у асабовых картках членаў відаць, што актыўна ўдзельнічала ў рабоце пленуму і выконвала заданьні бюро толькі... 12 чалавек. На асабовых картках астатніх членаў сэкцыі ёсьць адзнакі: «работаў недастакова», «на рабоце ся бе не апраўдаў», альбо «ні на пленумах, ні наогул у рабоце ня прымаў ніякага ўдзелу». Ёсьць на некаторых асабовых картках і такія характарыстыкі: «наведаў 8 пленумаў сэкцыі, работу і заданьні, якія яму даваліся, ня выконваў, дзякуючы таму, што ён знаходзіўся на адказнай працы саюзу харчавікоў, а зараз у МЦРК»..

Такія адзнакі аб рабоце членаў сэкцыі РСІ і актыўны ўдзел у рабоце сэкцыі толькі 12 чалавек,—сьцьвярджаюць аб «очковтирательствах» з боку Менгарсавету, калі апошні ў справаздачы сэкцыі кажа аб актыўнасьці членаў яе. Замест актыўнага ўдзелу ў рабоце сэкцыі, члены ў апошні час зусім адарваліся ад сэкцыі, ня ведаюць што нават робіцца ў сэкцыі і большасьцю ня ўдзельнічаюць у яе работах. На прадпрыемствах «Кастрычнік», «Пралетары», «Адраджэньне», «Бальшавік» і інш. ледзь удалося знайсьці аднаго члена гарсавету. Большасьць з іх выехалі з Менску, працуюць па-за Менскам, альбо вучацца ў навучальных установах Масквы і Ленінграду, а ў гэты час у гарсавеце ўсе яны лічацца... актывістамі.

Член сэкцыі РСІ Менгарсавету — работніца ф-кі «Кастрычнік» т. Ідэльчык вось як ахарактарызавала работу сэкцыі: «Першыя 6 месяцаў работа ў сэкцыі была пастаўлена добра. Потым пачаліся частыя зьмены старшынь сэкцый, наступіў час адпускоў і работа занепала. У апошні час яе зусім няма. Увесь час сэкцыі вельмі слаба дапамагаў прэзыдыум гарсавету. Амаль ніхто з членаў прэзыдыуму ніколі ня ўдзельнічаў на пасяджэньнях сэкцыі». Вось галоўныя прычыны бязьдзейнасьці сэкцыі, якая доўгі час ужо фактычна ня існуе.

Замест мабілізацыі рабочых мас вакол задач сэкцыі, замест удзелу іх у правадзімых чыстках савапарату і шэфстваваньня прадпрыемстваў над установамі і г. д.,—у сэкцыі РСІ гарсавету апартуністычная бязьдзейнасьць.

Брыгада газэты «Савецкая Беларусь»
Паўднёвы.
Пакроўскі.

Наказ Менгарсаветам выкананы дрэнна

Справаздачны сход Гарсавету ў групкоме працасьветы ледзь налічваў 50 проц. яўкі выбаршчыкаў: з 445 выбаршчыкаў на сходзе прысутнічала толькі 225. Прычым, працаўнікоў Дзяржаўнай бібліятэкі замест 73—зьявілася толькі 18, а з калектываў музэй рэвалюцыі і інш.—13 з 75-ці. Частка з іх, праўда, была занята на вячэрняй рабоце, але-ж ня гэткая колькасьць. Прадстаўнікі гэтых мясцкомаў заявілі, што з калектыву Дзярж. бібліятэкі бясприччынна адсутнічае 35 асоб, а з калектыву музэю рэвалюцыі —25.

На сходзе шмат увагі было адведзена абгаварэньню работы Гарсавету ў галіне культурнага будаўніцтва.

Выбаршчыкі ў сваіх выступленьнях адзначылі, што Гарсавет недастаткова аддаваў увагі культурнаму будаўніцтву: новых школ не будаваў (пабудавана толькі адна школа і тая не за справаздачны пэрыяд. **Наказ аб пабудаваньні школы на Пярэсьпе нявыканан.**

Якасьць жыльлёвага будаўніцтва дрэнная: новапабудаваныя кватэры цякуць; баракі збудаваныя для студэнтаў (работа Менбуду) маюць кожны па 2 пакоі (крайніх) зусім непрыгодных для жыцьця), холад, вецер сьвішча ў вушы, шчыліны ў сьпенах, ацяпленьне недастатковае, залы пры бараках няма, трэба хадзіць на чыгунку аднастасьць, адрываць час ад вучобы, або плаціць 30 руб. за 3 бочкі прыватніку за падвоз.

Зьвяртае на сябе ўвагу антысанітарны стан гораду. Ня кажучы ўжо пра акраіны, дзе тратуараў няма, ногі ломіш па выкапаных для каналізацыі канавах, упацёмках топішся у гурбах сьнегу,—цэнтр ня можа пахваліцца належным парадкам: сьнег на вуліцах ня чысьціцца, пра абсыпку сьлізкага месца пяском і казаць ня варта, двары завалены рознымі сьмецьцём, брудам, з прыбіральняў ня вывозіцца, адусюль страшэнна сьмярдзіць.

Асабліва выпуклен на сходзе стан з бяспрытульнасьцю. Работа дзіцячых дамоў і калёній занепала. Шмат бяспрытульных—падросткі (па 22 гады). Іх нельга выхоўваць разам з 10-цігадовымі дзецьмі. Вандруючы па горадзе, бяспрытульныя скарыстоўваюць шкодныя элемэнты. Трапляючы ў школы, дзіцячыя дамы, такія бяспрытульныя ствараюць сацыяльную небясьпеку для будучай грамады. Упаканьню бяспрытульных з калёній спрыяюць дробныя падачкі ім ды падкормліваньне ў сталоўках недаедкамі. Грамадзкасьць у асобе т-ва «Прыяцель Дзяцей» займалася выключна гандлем, адкінуўшы належную ўстаноўку. Зараз капітал т-ва «П. Д.» дасягнуў 170.000, грошы ляжаць у банку, а бяспрытульным, апроч дробных падачак, грунтоўнай дапамогі няма. Ні т-ва «П. Д.», ні Гарсавет, Наркамасьветы ня хочуць брацца за гэтую справу, кожны ківае адзін на аднаго. Гарсавет дайшоў да таго, што высяліў інспэктара па справах бяспрытульных некуды на Ракаўскую ці Койданаўскую вуліцу, абы толькі бяспрытульныя ня швэндаліся каля Гарсавету, не мазолілі вачэй.

Барацьба з бяспрытульнасьцю павінна быць узмоцнена. **Г.**

„Замест сходу напішам актыў“

Падрыхтоўчая работа да перавыбараў саветаў па Асьвейскім местачковым савеце праходзіць вельмі дрэнна. Сходы беднаты скліказіся два разы і абодвы разы сарваліся. На жаночы сход сабралося мала жанчын; з гэтае прычыны давялося аб'яднаць гэты сход са сходам моладзі. У сувязі з дрэннай падрыхтоўкай, на скліканым мястэчковым саветам справаздачна-перавыбарчым сходзе прысутнічала замест 500 выбаршчыкаў толькі 22 у ліку якіх ня было ніводнага рабочага, батрака і бедняка.

Пасьля дакладу і заключнага слова старшыні местачковага савету некаторыя прапанавалі перанесьці прыняцьце рэзалюцыі на заўтрашні сход, але старшыня РВК тав. Осіпаў заявіў: **«рэзалюцыю трэба прыняць сёньня, а калі сход у 22 асобы ня мае права даваць ацэнкі, дык мы ў пратаколе замест «сход» напішам: «актыў».**

Ці бывае ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту актыў без рабочых, батракоў і беднякоў і ці не зьяўляецца такая махінацыя ачкаўціраце льствам?

Асьвея. **Б.**

Не прыстасаваўся да сучасных тэмпаў

Вульскі РВК ня ведае, па якіх сельсаветах у раёне прайшлі перавыбары і колькі яшчэ трэба пераабраць, а на запытаньне:—«дзе рабіў РВК і яго аддзелы справаздачы аб рабоце перад выбаршчыкамі», сакратар РВК у замяшаньні з вінаватай усьмешкай адказвае, што **не памятае выпадку, каб РВК даваў справаздачу выбаршчыкам.**

У сваё апраўданьне ён зазначыў, што, калі адзін з прадстаўнікоў выехаў у сельсавет на справаздачу, ён яе не зрабіў, бо а 7 з палов. гадзіне ўвечары (сход быў назначаны, а 8 гадзіне), ніхто з сялян не зьявіўся.

Праежджы.

Даёш тэмпы!

Яшчэ і да гэтага часу практычная падрыхтоўка да другой бальшавіцкай ў Бабруйскім раёне вясны ня мае належнага тэмпу, яшчэ і да гэтага часу кантрольныя лічбы раённага пляну не даведзены да сельскіх саветаў, калгасаў, вёсак. Само сабою зразумела, што ня маючы кантрольных лічбаў, калгасы раёну яшчэ не прыступілі да прапрацоўкі сваіх калгасных плянаў веснавой сяўбы.

З-за адсутнасьці прапрацоўкі пытаньняў падрыхтоўкі да веснавой сяўбы і адсутнасьці кантрольных лічбаў з цэнтру, 2 разы пытаньне веснавой сяўбы здымалася з абвесткі дню прэзыдыуму райвыканкому.

Стварэньне насенных фондаў у калгасах праводзілася недапушчальна марудна. Згодна з данымі дырэктывамі, кожны калгас павінен ужо стварыць насенны фонд, але да практычнай работы ў гэтым напрамку прыступілі толькі 10 проц. калгасаў.

Амаль нічога ня зроблена ў галіне арганізацыі ачысткі насеньня. Тут наглядаецца поўная адсутнасьць кіруючай работы: плянаў зерняачышчэньня няма, работа ідзе самацёкам. Па калгасах на 20 сьнежня ачышчана ўсяго каля 200 цэнтнераў насеньня.

Д. Аланскі.

Насенфонды ня створаны

З засыпкаю насеньня ў калгасах Слуцкага раёну справа амаль не пачата, хоць пастанова ўраду прадугледжвае скончыць засыпку насеньня ў старых калгасах не пазьней 1 студзеня 1931 году. Новаарганізаваныя калгасы таксама ня прыступалі да адбору і засыпкі насеньня.

Большасьць старых калгасаў ня толькі не адабралі і не ачысьцілі, але яшчэ і не абмалацілі збожжа на насеньне.

Па лініі КСУ таксама нічога ня робіцца, насенфонды ня зьбіраюцца.

Трэба зараз-жа зрабіць карэнны пералом у засыпцы насеньня ў калгасах, а таксама і па лініі КСУ.

Ян Прыбытан.

Сусьветны эканамічны крызіс паглыбляецца

Забастовачны фронт Рура расьце і мацнее

БЭРЛІН, 8. Па ўсёй Рурскай вобласьці ня спыняецца жорсткі паліцэйскі тэрор. У Лаборге двое рабочых цяжка ранены. Рад шахт працягвае забастоўку. На шматлікіх шахтах прыняты пастановы абвясьціць забастоўку ў выпадку, калі трацейскі суд выкажацца за зьніжэньне зарплаты.

На шахце «Князь Леапольд» пры спыненьні забастоўкі рабочыя выказалі поўнае давер'е цэнтральнаму забастовачнаму камітэту і заявілі рэзкі пратэст супроць паліцэйскага тэрару і штрэйкбрэхэрства сацыял-фашысцкіх і хрысьціянскіх прафсаюзных лідэраў. Па ўсёй вобласьці рабочыя масамі ўступаюць у рэвалюцыйную прафарганізацыю і чырвоны саюз гарнякоў.

Беспрацоўе і голад у ПАЗШ

НЬЮ-ЁРК, 8. Беспрацоўе ў Злучаных Штатах расьце. Шмат рабочых выселена з кватэр за няўплату кватэрнай платы. Другія пазбаўлены апалу. У Нью-Ёрку на шматлікіх дзіцячых чаргах, ня гледзячы на холад, стаіць штодзённа больш чым па тысячы дзяцей, чакаючы хлеба і малака. Сярод беспрацоўных зарэгістраваны выпадкі галоднай сьмерці.

Камуністычная партыя ПАЗШ вядзе актыўную работу сярод беспрацоўных, арганізоўваючы ў шмат якіх гарадох дэманстрацыі пад лёзунгам рэвалюцыйных патрабаваньняў, у прыватнасьці, патрабаваньні страхаваньня ад беспрацоўя. Адбываюцца сутычкі з паліцыяй.

Аднačасова атрымліваюцца паведамленьні аб росьце голаду і жабрацтва сярод фэрмэраў, у раёнах, якія пацярпелі ад засухі. Чырвоны крыж і чыноўнікі спрабуюць зьменшыць памеры голаду, але зьвесткі, якія пранікаюць у друк, гавораць аб другім. У некаторых раёнах Арканзаса адчуваецца недахват у харчаваньні, абутку і вопратцы. Нават дзяцей кормяць кукурузным хлебам. Разьвіваюцца хваробы. Ужо мелі месца хваляваньні сярод фэрмэраў, але зьвесткі аб гэтым ня былі прапушчаны ў друк.

Адзіны фронт гарнякоў Ангельшчыны ў барацьбе з капіталам

ЛЁНДАН, 7. Урад робіць шалёныя намогі для ліквідацыі забастоўкі паўднёва-Уэльскіх гарнякоў.

Намечана новая нарада з прадстаўнікамі шахтаўладароў і гарнякоў. Забастоўка ў Паўднёвым Уэльсе працягвае ў абстаноўцы пралетарскай салідарнасьці. Шахцёры розных раёнаў Англіі і Шатляндыі шлюць прывітаньне і камандыруюць дэлегацыі да вугляконаў Паўднёвага Уэльса, заклікаючы іх упарта працягваць барацьбу з-за агульных інтарэсаў рабочае клясы.

У вугальным раёне Варвікшыры пачаўся канфлікт аналёгічны Паўднёва-Уэльскаму. Перагаворы прафсаюзу з шахтаўладарамі перарваны. Настрой гарнякоў ваяўнічы. Забастоўка пасьля сканчэньня тэрміну часовай згоды няўхільна.

Кляса супроць клясы

КАРДЫФ, 7. Нацыянальны камітэт руху меншынства гарнякоў апублікаваў заклік, у якім гаворыцца: «гарнякі Уэльса вядуць барацьбу супроць спробы прадпрыемцаў зьнізіць зарплату. Чыноўнікі з агульна-ангельскай фэдэрацыі гарнарабочых пад кіраўніцтвам капіталістычнага лэйбарысцкага ўраду вядуць сьвядома палітыку ізаляцыі і паражэнцтва. Першымі былі ізаляваны шатляндзкія гарнякі, пакольк і гарнякі Уэльса былі ашуканствам уцягнуты ў незаконную часовую згоду. Зараз прымаюцца ўсе меры, каб ізаляваць Уэльс ад астатніх вугальных раёнаў. Калі Уэльс пацярпіць паражэньне дык ад гэтага пацерпяць усе другія вугальныя акругі. З кожнай з іх будзе зроблена таксама. Нацыянальны камітэт руху меншынства гарнякоў заклікае гарнякоў усяе Англіі прадэманстраваць сваю салідарнасьць з Уэльскімі таварышамі.

Акруговыя камітэты руху меншынства павінны арганізаваць гарнякоў і весьці энэргічную барацьбу супроць здрадніцкай палітыкі фэдэрацыі горнарабочых, павінны разьвіваць барацьбу за адзіны фронт. Гарнякі павінны дэманстраваць на шахтах, на вуліцах. Неабходна стварыць фонды межрабпому для таго, каб забясьпечыць арганізацыю забесьпячэньня харчаваньня цэнтру, дзе вядзецца барацьба. Рабочыя павінны адхіліць зьніжэньне зарплаты. Рабочыя павінны выступіць супроць лейбарысцкага ўраду і іх саюзьнікаў з фэдэрацыі горнарабочых.

На вуліцу, на падтрыманьне Паўднёвага Уэльса,—гэта павінна быць лёзунгам кожнай шахты. Падрыхтоўвайце выступленьне ў агульна-ангельскім маштабе пад кіраўніцтвам руху меншынства за 7-мі гадзінны рабочы дзень, за падвышэньне зарплаты, за ўзмацненьне мер па ахове бясьпечнасьці рабочых».

Рост беспрацоўя ў Ангельшчыне

ЛЁНДАН, 7. На 29-га сьнежня 1930 году лік зарэгістраваных беспрацоўных раўняўся 2 мільёнам 643.127, на 1 мільён 132.896 больш у параўнаньні з канцом мінулага году.

Цяперашні лік беспрацоўных зьяўляецца рэкордным у Англіі.

НА ШТУРМ ВЫШЫНЬ ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ

Завод „Камунар“ уступіў у трэці год з перавыкананьнем прамфінпляну ўдарнага кварталу на 5,37 проц. Кавальскі цэх атрымаў узнагароду—пераходны сьцяг. Мэханічны цэх— прэмію ў 5000 руб.

Дырэктар Гомельскай запалкавай фабрыкі „Везуві“ выступіў супроць прамфінпляну на 1931 год. Кіраўніцтва Пятрыкоўскай прафтэхшколы агнятрывалага будаўніцтва, Гомельскага дарожна-будаўнічага тэхнікуму, Шклоўская папяровая фабрыка „Спартак“ не дааццэньваюць значэньня падрыхтоўкі кадраў для прамысловасьці

Арганізуем масы для пераможнага ажыцьцяўленьня пяцігодкі ў 4 гады. Накіруем агонь супроць правага і „левага“ апартунізму

„...Трэба надалей моцна трымаць бальшавіцкія тэмпы разгортваньня індустрыі, трэба цьвёрда ісьці наперад па гэтым шляху ўсямерна замацоўваючы посьпехі індустрыялізацыі“
(З дакладу т. Молатава аб народна-гаспадарчым пляне на 1931 г. на III сэсіі ЦВК СССР)

„Неабходна зьвярнуць пільную ўвагу на падрыхтоўку кадраў кваліфікаваных рабочых (фабзавуч, курсы, інструктаж на вытворчасьці і г. д.). Ліквідацыя беспрацоўя і вялізарны рост патрэбнасьці ў рабочай сіле для новых прадпрыемстваў робяць гэту задачу асабліва важнай і баявой“
(З пастановы Прэзыдыуму ВСНГ СССР аб кантрольных лічбах на 1931 г.)

Супроць апартунізму ў падрыхтоўцы кадраў

Прамысловасьць Савецкага Саюзу прыступіла да выкананьня прамфінпляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі. На аснове правільнай ленінскай лініі Цэнтральнага Камітэту нашай партыі, у барацьбе з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, у барацьбе з «левымі» загібамі і прымірэнцтвам да іх, рабочая кляса, СССР уступіла ў трэці рашаючы год яшчэ больш згуртаванай вакол ленінскай партыі і яе ЦК.

На падставе дасягнутых посьпехаў на ўсім фронце першых двух год пяцігодкі ў трэцім годзе значна павялічаны тэмпы будаўніцтва сацыялізму. Нядаўна прыняты ЦК УсеКП(б) народна-гаспадарчы плян СССР яскрава аб гэтым гаворыць. Згодна гэтага пляну павялічаны сродкі на разьвіцьцё прамысловасьці, капітальнага будаўніцтва, новых фабрык і заводаў. Па народна-гаспадарчым пляне прадукцыя павінна ўзрасьці з 20.567 млн. рублёў у 1930 г. да 29.675 млн. рублёў у 1931 годзе.

Па БССР, як часткы магутнага Савецкага саюзу, мы таксама маем значныя посьпехі. Сродкі на далейшае разьвіцьцё прамысловасьці БССР павялічаны на 1931 год на 115 проц. у параўнаньні з мінулым 1930 годам.

Такое шырокае разьвіцьцё прамысловасьці БССР магчыма толькі на аснове правільнай генэральнай лініі нашай партыі, на падставе разьвіцьця сацыялістычных форм працы—сацспаборніцтва, ударніцтва, на аснове барацьбы з расійскім шавінізмам, як галоўнай небясьпекай, беларускім нацдэмакратызмам і шавінізмамі розных колераў.

Шпаркі рост нашай прамысловасьці ставіць зараз востра пытаньне падрыхтоўкі тэхнічных кадраў для нашай прамысловасьці паколькі беспрацоўе ў нас у асноўным ліквідавана.

Але-ж па гэтым шляху мы маем рад перашкод. Ня ўсе яшчэ зразумелі вельмі важнае значэньне падрыхтоўкі кадраў. Тыя кадры, якія ўжо знаходзяцца па вучобе ў розных навучальных установах, (прафшколах, тэхнікумах і г.д.) ня маюць умоў, патрэбных для вучобы. Нашы кадры ня маюць інтэрнатаў, дрэнна забясьпечваюцца харчамі, маюць слабыя пэдагагічныя кадры, а ў дадатак да ўсяго гэтага шмат якія арганізацыі як партыйныя, так і прафэсыянальныя і гаспадарчыя недастаткова зразумелі важнасьць падрыхтоўкі кадраў.

Да падрыхтоўкі кадраў для нашай прамысловасьці падыходзяць апартуністычна. Так, напрыклад, у Чашніках на курсы Цэнтральнага Інстытуту працы прымаюць усіх, без усялякага клясавага падыходу. Рад тэхнікумаў і прафтэхшкол не забясьпечаны інтэрнатамі, не абсталяваны з-за бязьдзейнасьці адпаведных органаў (Гомельскі Дарожна-будаўнічы тэхнікум, Петрыкаўская школа агнятрывалага будаўніцтва і г. д.).

Такое становішча, такі апартуністычны падыход да падрыхтоўкі кадраў можа да некаторай ступені затармазіць шпаркае разьвіцьцё сацыялістычнай прамысловасьці ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

Вялізарныя задачы і шпаркі рост прамысловасьці ў рашаючым годзе патрабуюць рашаючых крокаў у падрыхтоўцы кадраў. Гэтыя кадры павінны быць падрыхтаваны.

Няма парадку

У Бабруйску Галоўдартрансам БССР арганізавана школа Дорстройвуча. Вучні знаходзяцца ў агульным інтэрнаце і ў дрэнных умовах. Толькі нядаўна аслабаніліся ад куч гліны, якая знаходзілася ў інтэрнаце. Тут няма ніякага парадку. Зусім мала сьвету.

Селькор.

Рыхтуем кадры

Па заданьні дырэкцыі МББ чыгункі, трэці (Аршанскі) эксплёатацыйны раён гэтай чыгункі павінен падрыхтаваць да 1 красавіка 1931 году 1265 чалавек розных спэцыяльнасьцяй, якія будуць патрэбны раёну. У лік гэтай колькасьці ўваходзяць: 90 цягніковых машыністаў, 120 іх памочнікаў, 210 змазчыкаў, 160 качагараў, 207 стрэлачнікаў, а таксама кандуктары, агляднчыкі вагонаў, дзяжурныя па станцыі, сыгналісты, касіры-весаўшчыкі, апэратары, канторшчыкі, тэлеграфісты, тэлефаністы, манцёры службы СЦБ, манцёры плянава-папярэдняга рамонту, сьлесары, токары, машыністы для вадакачак і г. д. Усе спэцыяльнасьці павінны рыхтавацца праз курсы, якія зараз і арганізаваны ў Воршы, Менску, Барысаве і на ст. Слаўнае.

Зараз у **Воршы** працуюць курсы для падрыхтоўкі гэтых кадраў. Усяго гэтыя розныя курсы рыхтуюць 514 чалавек розных сьпэцыяльнасьцяй. Часткова на гэтых курсах рыхтуюцца новыя кваліфікаваныя работнікі з беспрацоўных і ўтрыманцаў, часткова—з дэмабілізаваных чырвонаармейцаў. Некаторыя даюць падвышэньне кваліфікацыі тым, хто ўжо працуе. Курсы машыністаў унутранага згараньня складаюцца выключна з тых рабочых, якія ўжо часткова знаёмы з гэтай справай.

У **Менску** арганізавана 10 курсаў, якія рыхтуюць 262 чал. розных спэцыяльнасьцяй. У Барысаве маецца 6 курсаў на 65 чал. На ст. Слаўнае курсы рыхтуюць 30 чал. камэрцыйных агентаў. Звыш усяго гэтага на розных іншых станцыях праз курсы рыхтуецца яшчэ 219 чал. стрэлачнікаў.

Частка курсаў ужо скончыла працу, падрыхтаваўшы патрэбных працаўнікоў. Гэта гаворыць за тое, што ў справе падрыхтоўкі кадраў 3-ці раён заданьне дырэкцыі дарогі выконвае поўнасьцю, і свае патрэбы ў кваліфікаванай рабочай сіле задаволіць. Зараз мы паглядзім, як працуюць гэтыя курсы, як іх забясьпечвае дарога ўсім патрэбным.

Перш за ўсё патрэбна сказаць, што курсы вельмі дрэнна наведваюцца. Наведваньне дрэннае і ў Воршы, і ў Менску і наогул па лініі. Толькі частка курсаў у Воршы, гэта—курсы паммашыністых, машыністых, сьлесароў, галоўных кандуктароў, наведваюцца добра—на 100 проц. Астатнія курсы наведваюцца курсантамі вельмі слаба. Сярэдні процант наведваньня курсаў па ўсім раёне складае 50 проц. Патрэбна сказаць, што ні прафсаюзныя арганізацыі, ні адміністрацыя на гэта не зьвяртае належнай ўвагі, і амаль што ня прымае мер да ўстанаўленьня наведваньня курсаў належным парадкам. Да гэтага часу ў працы курсаў яшчэ не разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Дрэнна справа і з падручнікамі. Усе курсы задаволены ў сярэднім толькі на 60 проц. патрэбнымі падручнікамі. Аддзел кадраў МББ чыгункі наконт гэтага ўсё яшчэ ніяк ня можа паклапаціцца, ня глядзячы на тое, што адсутнасьць падручнікаў вельмі перашкаджае нармовай працы курсаў і затрымлівае выпуск патрэбных кваліфікацый. Выкладчыкаў таксама не хапае. У Воршы толькі зараз пачалі скарыстоўваць для выкладаньня ўсіх сьпэцыялістых, якія могуць выкладаць.

Усе курсы па падрыхтоўцы кадраў знаходзяцца на ўтрыманьні аддзелу кадраў Дырэкцыі МББ чыгункі. На правядзеньне курсаў, якія працавалі да 1 кастрычніка і да 1 студзеня, сродкі дырэкцыяй былі дадзены. Але на ўтрыманьне курсаў, якія працуюць зараз, тэрмінам сканчэньня працы якіх вызначан красавік альбо май—дырэкцыя дарогі яшчэ нічога не дала.

Трэці раён МББ чыгункі павінен паклапаціцца аб зьнішчэньні тых недахопаў, якія маюць месца ў працы курсаў зараз. Трэба дабіцца належнага наведваньня курсаў курсантамі, а таксама паставіць рашуча пытаньне перад Дырэкцыяй дарогі аб забясьпячэньні курсаў падручнікамі і належнымі сродкамі.

Зараз па ўсім раёне становішча з працоўнай сілай, з кадрамі—дрэннае. Кваліфікаваных рабочых нехапае, а разам з гэтым нехапае ў Воршы і чорнарабочых для Дэпо, бо Біржа Працы з прычыны адсутнасьці беспрацоўных, ня можа забясьпечыць запатрабаваньні чыгункі ў працоўнай сіле. Гэтае дрэннае становішча пагаршаецца яшчэ цякучасьцю рабочай сілы, якая мела значнае месца па раёне. Толькі зараз цякучасьць крыху спынілася дзякуючы ўзмацніўшайся барацьбе з гэтым хваробным зьявішчам.

Алесь Кудрын.

Спадзяюцца на самацёк

Акцыянэрнае таварыства «Устаноўка» разгортвае ў раёнах курсы па падрыхтоўцы будаўнічых рабочых на 1931 год. Грэскі РВК катэгарычна адмаўляецца ад дапамогі т-ву «Устаноўка» ў арганізацыі. Памяшканьне не прыстасавана для ўмоў заняткаў з курсантамі, ды і нельга там весьці заняткі таму, што няма даху і печак. Калі інструктары «Устаноўкі» прасілі РВК аб перакідцы з іншага будаўніцтва рабочай сілы на базу для сканчэньня рамонту, дык тэхнік РВК катэгарычна адмовіўся, хоць можна было перакінуць з забудовы Нардому. Вярбоўка на курсы не пачата, прафарганізацыі спадзяюцца на самацёк.

Грэскаму РК КП(б)Б трэба прыняць рашучыя меры для выкананьня пастановы ЦК УсеКП(б) ад 20 кастрычніка 1930 г. аб падрыхтоўцы кадраў.

Аўсянікаў.

Правесьці рэарганізацыю прафшколы

Па пастанове СНК усе прафтэхшколы рэарганізуюцца ў ФЗВ і тэхнікумы. Полацкая прафтэхшкола агнятрывалага будаўніцтва зьліваецца з тэхнікумам Саюзсельбуду па сельгасбудаўніцтву і рэарганізуецца ў тэхнікум.

Што-ж робіцца для рэарганізацыі школы? На сёньняшні дзень нічога.

Гарсавет яшчэ стала ня вызначыў адпаведнага памяшканьня пад тэхнікум. Ніхто ня цікавіцца абсталяваньнем для тэхнікуму. Памяшканьне патрабуе рамонту. На гэты рамонт можна скарыстаць студэнтаў, улічваючы недахоп у рабочай сіле, але нічога ня робіцца для гэтага.

Недастатковая колькасьць падручнікаў для тэхнікуму можа адбіцца на рабоце тэхнікуму.

Трэба зараз жа ўзяцца за правядзеньне пастаўленых перад сабой задач, у тэрмін правесьці рэарганізацыю прафтэхшколы.

Хмель.

Хто зрывае ўдарніцтва

У мінулым годзе ў Менскім Палітэхнікуме ўдарніцтва і сацспаборніцтва далі добрыя вынікі. Выканана праграма ў свой час, а на шмат якіх курсах здадзены ўсе залікі. Разам з тым шмат студэнтаў працавалі на грамадзкай працы. У гэтым годзе адчуваецца небясьпека зрыву ўдарніцтва і сацспаборніцтва. Так, на 1-м курсе Дарожнага Тэхнікуму лекцыі часта зрываліся, выкладчыкі спазьняюцца, замест поўнага часу скарыстаньня лекцый, скарыстоўваецца толькі 30—35 хвілін. Часта выкладчыкі апрача таго, што спазьняюцца, на лекцыях займаюцца рознымі байкамі, анэкдотамі (Пятроў).

Ёсьць выкладчыкі, якія казённа адносяцца да выкладаньня. Так, напрыклад, Шыдлоўскі зусім ня ўлічвае тое, ці ведаюць студэнты, ці не. Калі запытаюцца студэнты—ён злуецца. На III-м курсе архітэктараў на палову адсутнічаюць выкладчыкі, а на III-м курсе дарожнікаў таксама не пачата яшчэ выкладаньне архітэктурнага праекту, які павінен быў пачацца два з паловай месяцы таму назад.

Ёсьць яшчэ шмат другіх недахопаў. Але надта шмат у чым вінны і студэнты. Спазьненьне або зусім адсутнасьць на лекцыі на 1-х курсах. Навукова-тэхнічныя турткі яшчэ не знайшлі сабе месца ў нашых занятках.

Мы бачым, што становішча небясьпечнае. Зараз павінна быць наладжана канфэрэнцыя студэнтаў і выкладчыкаў, якая павінна карэнным чынам перабудаваць падрыхтоўку кадраў сапраўды па-ўдарнаму.

Віннікаў З.

Дайце інтэрнат

У г. Пятрыкове (Мазыршчына), у мінулым годзе арганізавалася прафтэхшкола агнятрывалага будаўніцтва, у якую было залічана 25 чалавек. Становішча гэтых 25 вучняў у мінулым годзе было вельмі дрэннае. Вучням даводзілася валяцца па прыватных кватэрах у гразі, холадзе і голадзе.

Вучні думалі, што зараз становішча палепшыцца. Але атрымалася адваротнае. Да гэтага часу няма сталага інтэрнату і вучняў ганяюць з аднаго інтэрнату ў другі. З ядою таксама вельмі кепска. Ніякімі скідкамі вучні не карыстаюцца. Каапэрацыя, Райвыканкам, Гарсавет і інш. ня хочуць зварочваць увагі на дрэннае становішча прафтэхшкольцаў.

Школа ня мае ніводнага вучня на першым курсе і прыдзецца вучыцца толькі II курсу, у той час, калі школа павінна мець 1 і II курс. Належныя органы павінны зьвярнуць увагу.

Долата.

Новы закон аб рэгістрацыі асоб, якія шукаюць працы, і аб пасылцы іх на работу

Востры недахват у рабочай сіле, выкліканы вялізарным ростам сацыялістычнага будаўніцтва, патрабуе ўцягненьня новых кадраў ва ўсе галіны разьвіваючайся народнай гаспадаркі. Адным з шляхоў, які вырашае праблему кадраў, зьяўляецца пашырэньне кола асоб, якія рэгіструюцца кіраўніцтвамі кадраў, рэарганізаванымі з Бірж Працы. У сувязі з гэтым цікава спыніцца на апошнім пастанаўленьні Наркампрацы СССР ад 23-га сьнежня 1930 году, якое рэгулюе гэтае пытаньне.

Па новым пастанаўленьні ня члены прафсаюзаў могуць рэгістравацца ў кіраўніцтве кадраў толькі тыя асобы, якія маюць правы выбіраць у саветы: дзеці рабочых, служачых і вайсковаслужачых; жонкі, разьведзеныя жонкі і ўдовы рабочых і служачых, вайсковаслужачых і вучняў; члены сямей рабочых і служачых, назначаных у кадры РСЧА, накіраваных на работу ў калгасы і саўгасы і членаў Гарсаветаў, вылучаных для работы ў вёсцы; звольненых з РСЧА і ваенізаванай аховы; б. чырвонаармейцы і чырвоныя партызаны; узнагароджаныя ордэнам Саюзу ССР, інваліды працы і вайны, прызнаныя прыдатнымі да работы, а таксама жонкі, удовы і дзеці апошніх; былыя члены арцелі калі яны прапрацавалі ў арцелі 3 апошніх гады і зьвярнуліся за работай не пазьней 6-ці месяцаў пасьля выхаду з арцелі, дзеці іх, а так сама кустароў-адзіночак; вынаходнікі, батракі, бедьнякі-аднаасобнікі, калгасьнікі і іх дзеці; жанчыны адзіночкі, якія знаходзяцца на вучоце здрав-аддзелаў і сабезу; асобы, якія адбылі меры сацыяльнай абароны, калі перад прыцягненьнем да адказнасьці яны адносіліся да аднэй з пералічаных катэгорый і зьвярнуліся за работай не пазьней 6-ці м-цаў пасьля адбыцьця меры сацыяльнай абароны. Поруч з асобамі, ня маючымі работы, павінны рэгістравацца таксама асобы, якія працуюць не па спэцыяльнасьці, калі яны жадаюць перайсьці на другую работу па сваёй спэцыяльнасьці, якая зьяўляецца дэфіцытнай.

Гэтае палажэньне не распаўсюджваецца на асоб, якія працуюць на транспарце і на будаўнічых і сэзонных работах.

Рэгістрацыя ў кіраўніцтве кадраў не дае права на якія-небудзь ільготы. Усе зарэгістраваныя павінны быць пасланы на работу не пазьней 3-х дзён, а звольненыя з РСЧА — у дзень рэгістрацыі.

Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на тое, каб у прамысловасьць (асабліва на новыя заводы) і на транспарт накіроўваліся асобы, найбольш блізкія па сваім спэцыяльным палажэньні да рабочае клясы (рабочыя, члены іх сем'яў, звольненыя з РСЧА, саматужнікі, якія былі членамі арцелі, батракі, беднякі-аднаасобнікі і калгасьнікі).

Злосныя дэзарганізатары вытворчасьці, самавольна пакідаючыя работу, у выпадку звароту за работай у кіраўніцтва кадраў, не пасылаюцца на працягу шасьці месяцаў на работу ў прамысловасьць або транспарт і прымаюцца на асобны вучот.

Асобы, якія адмаўляюцца без уважлівых прычын ад работы, якая ім прапануецца па спэцыяльнасьці (хоць-бы і на выезд), зьнімаюцца з вучоту на тэрмін да шасьці месяцаў. У выпадку іх звароту за работай на працягу гэтага тэрміну яны могуць быць скарыстаны на масавых фізычных работах (лесаспрацоўкі, лесазагатоўкі, барацьба са сьнежнымі заносамі і гэтак далей).

Уважлівымі адказамі ад работы, якую прапануюць кіруючыя кадры, лічацца: адказ па хваробе, пацьверджаны урачэбна-экспэртнай камісіяй пры кіраўніцтве кадраў, адказ з прычыны не прадастаўленьня жыльлёвай плошчы пры перакіданьні ў другую мясцовасьць і адказ жонкі ад работы, зьвязанай з ад'ездам з мясцовасьці, дзе жыве яе муж.

З. Рохлін.

НАПЕРАД, ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ!

Рабочая кляса Савецкага Саюзу сустрэла трэці год пяцігодкі разгорнутым сацыялістычным спаборніцтвам. Новая хваля энтузіязму рабочых нахлынула для перамогі на гаспадарчым фронце. Шэрэнгі ўдарнікаў—барацьбітоў за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады шпарка растуць.

Адзін з буйнейшых заводаў г. Менску,—**машына-будаўнічы завод «Камунар»** адзначае сёньня сваю перамогу, падагульвае вынікі герайчнай барацьбы другога году пяцігодкі і асобнага кварталу. Гэтая перамога дасягнута таму, што камунараўцы з першага дню другога году пяцігодкі згуртаваны, зьліта ў адно, калектывам, праз сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва пачалі выконваць вытворчыя заданьні.

Пачатак калектыўнай рабоце паклала арганізаваная ў сьлесарным цэху брыгада па зборцы камнядрабілак, якая паказала, што мэтады брыгаднай работы добрыя. Па іх прыкладу арганізоўваюцца новыя ўдарныя брыгады, вытворчыя калектывы, камуны. Узрастае лік ударнікаў на заводзе. К 1-му кастрычніка 1929 году ўдарнікаў маецца каля 500 чал. пры 800 рабочых на заводзе.

Першае паўгодзьдзе другога году пяцігодкі дало выкананьне вытворчай праграмы на 104 проц. са зьніжэньнем сабекошту на 27,3 проц. Посьпехі перавыкананьня ўскружылі галаву заводакіраўніцтву, заўкому і парткалектыву. Работа ў цэху дзякуючы гэтаму паслабла. Таму праграма ў ліпені месяцы выканана была толькі на 76 проц. і, значыцца, павялічыўся брак.

Ліпеньскі прарыў ускалыхнуў усе заводзкія арганізацыі, паставіў на ногі ўсю пралетарскую грамадзкасьць.

Ствараецца грамадзка-палітычны суд над бракам, над тымі, хто зьявіўся вінаватым у прарыве. Вынік,—зьмяняецца партыйнае і прафсаюзнае кіраўніцтва сьлесарнага цэху і адразу завод уступае на новыя рэйкі. Жнівеньская праграма перавыконваецца.

Адозва ЦК УсеКП(б) мабілізуе новыя сілы на выкананьне прамфінпляну па ўсіх яго паказчыках. Верасень месяц ліквідуе ліпеньскі прарыў поўнасьцю і закончвае другі год пяцігодкі. Выкананьне прамфінпляну на 103 проц. з перавышэньнем зьніжэньня сабекошту на 0,7 проц.

Ва ўдарны квартал камунараўцы ўступілі са складзеным сустрэчным прамфінпляном павялічаным на 56 проц. супроць выстаўленага прамфінпляну заводакіраўніцтвам, павялічыўшы вытворчую праграму ўдарнага кварталу на 40 проц. супроць апошняга кварталу другога году пяцігодкі.

Замацаваньне дасягнутых посьпехаў патрабавала ад камунараўцаў правесьці свае вытворчыя мажлівасьці: з 15 па 31 кастрычніка завод «Камунар» уступае ў вытворчыя манэўры.

Вытворчыя манэўры паставілі сьлесарны цэх у перадавы цэх, які да таго часу цягнуўся ў хвасьце. У такарным цэху зьмяняецца прафкіраўніцтва, якое не вяло барацьбы з лятунамі, прагульшчыкамі, не мабілізавала рабочай масы на перавыкананьне прамфінпляну, у ліцьцёвым цэху зьмяняецца бюро камсамольскай ячэйкі, зьмяняецца майстар кавальнага цэху т. Арлоўскі, які прыводзіў сваёй работай цэх да прарыву.

Рашэньне сакратарыяту ЦК КП(б)Б аб выпуску трох пераходзячых сьцягаў імя ЦК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ і ЦСПСБ рабочыя «Камунару» аднадушна ўхвалілі і выступілі на барацьбу за пяршынства, уступілі ва ўсесаюзны конкурс на лепшае прадпрыемства.

Па патрабаваньні рабочых абвешчаны конкурс паміж цэхамі за пераходны заводзкі сьцяг, які атрымаў ліцьцёвы цэх за лепшую работу ў першым паўгодзьдзі, за атрыманьне 5.000 руб., якія вызначаны заводакіраўніцтвам для прэміяваньня лепшага цэху.

Вытворчыя манэўры мабілізавалі ўсю рабочую масу на правядзеньне ў жыцьцё адозвы ЦК УсеКП(б). Парткіраўніцтва заводу ў гэты час пачала барацьбу з выяўленым апартунізмам на практыцы, праводзячы рашучую барацьбу на гэтым фронце.

Праграма кастрычніка і лістапада з посьпехам выконваецца. Старая гвардыя рабочых «Камунара» ў адказ інтэрвэнтам дае 25 лепшых старых рабочых у партыю. Камунараўцы абяцаюць перад партыяй і ўрадам выканаць праграму ўдарнага кварталу да тэрміну, 28 сьнежня, а рабочыя кавальнага цэху абавязаліся даць супроць вызначанай праграмы на 600 пар ціскоў больш.

Работа за 15 дзён сьнежня месяцу выявіла значны прарыў. Так, па машынабудаўніцтву прарыў на 10 проц., ліцьцю 25 проц., запасных частках камнядрабілкі 20 проц., ціскох 10 проц., бляшаных вырабах 10 проц., што ёсьць вынік паслабленьня кіраўніцтва трыкутнікаў цэхаў, якое не забясьпечыла верасьнёўскіх тэмпаў барацьбы за выкананьне заданьня рашаючага месяцу ўдарнага кварталу. Так канстатавала бюро парткалектыву, і зараз-жа вызначыла канкрэтныя мерапрыемствы па ліквідацыі прарыву.

Пагражаючым было становішча ліцьцёвага цэху, якое створана кіраўніцтвам цэху. Самацёк, боязьнь цяжкасьцяй, а не баявое кіраўніцтва ва ўдарным квартале. Кепская расстаноўка людзей у выніку чаго—прастой, павялічэньне браку, паслабленьне масава-палітычнай работы, павялічэньне прагулаў, цякучасьць рабсілы,—вось тыя ганебныя факты, якія паставілі пытаньне перад ліцьцёвым цэхам, што пераходзячы сьцяг імі будзе здадзены.

Прарыў ліцьцёвага цэху выкліканы праваапартуністычным парткіраўніцтвам цэху. «Раней было лепш працаваць, бо з сыравінай і грашыма ня было цяжкасьцяй, а зараз горш, бо з сыравінай і грашыма кепска»—вось апартуністычныя разважаньні сакратара ячэйкі ліцьцёвага цэху, які аналізуе прарыў.

А старшыня цэхкому ліцьцёвага цэху т. Манькоўскі 17 сьнежня катэгарычна адмовіўся ад работы, калі па яго думцы была «нізкай» расцэнка, і ня вышаў два дні на работу ў рашаючы момант.

Парткалектыў зьмяніў парткіраўніцтва цэху, жорстка ўдарыў па правых апартуністах, хоць яны і прызналі свае памылкі.

Для ліквідацыі прарыву ў ліцьцёвым цэху кінуты новыя сілы і цэх у апошнія дні выпускаў замест паўтары тоны 3 тоны ліцьця. У іншыя цэхі быў мабілізаваны адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал для дапамогі майстрам.

Рабочыя «Камунара» выканалі свае абавязацельствы перад партыяй і ўрадам: **прамфінплян ударнага кварталу выкананы на 105,37 проц.** Цэхі ліквідавалі прарыў і выканалі плян: **мэханічны на 155,8 проц., кавальны—130,5 проц., бляшаны—91,95 проц. і ліцьцёвы—97,75 проц.**

Бляшаны цэх недавыканаў праграмы толькі таму, што ня было цынку і волава і засталося шмат няскончанай прадукцыі, а ліцьцёвы ня мог за кароткі час датнаць упушчанае.

Камунараўцы падагулілі вынікі сваёй работы за другі год пяцігодкі і асобны квартал на ўрачыстым вечары 6-га студзеня.

З 1.300 рабочых заводу ахоплена ўдарніцтвам 887 чалвек і законтрактавана 800 чалавек. За лепшую работу на вечары прэміявана 89 лепшых рабочых ударнікаў і 14 чалавек адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу.

Ударны калектыў імя X зьезду ЛКСМБ па зборцы камнядрабілак прэміяваны за выпуск 23 камнядрабілак звыш праграмы па ўдарным квартале, з якіх 20 камнядрабілак у сьнежні месяцы.

Ударная брыгада па зборцы бэтанітавых варштатаў прэміявана поўнасьцю да сканчэньня праграмы раней тэрміну на 7 дзён і выпуск звыш пляну 44 варштатаў.

Іншыя ўдарнікі прэміяваны за энтузіязм, за ўдарную работу. Шмат хто з прэміяваных паказаў сапраўдныя камуністычныя адносіны да работы. Стругальшчык Манухін ня глядзячы на высокую тэмпературу і водпуск ад доктара працаваў падрад на 3-х зьменах для таго, каб ня было прастою ў брыгадзе па зборцы батанітавых варштатаў.

Не адзін такі Манухін. Іх шмат. Лепшыя з іх прэміяваны пад гучныя воплескі, пад аркестр. З трыбуны «Дому Культуры» перад 2-х тысячнай аўдыторыяй яны далі абавязацельства партыі і ўраду і ў трэцім годзе пяцігодкі не паслабляць тэмпаў, змагацца за пяцігодку ў чатыры гады, за генэральную лінію партыі супроць апартунізму і нацыянал дэмакратызму.

Пад бубенны бой піанэраў з трыбуны «Дому Культуры» абвяшчаліся імёны лжэўдарнікаў, якія зрывалі выкананьне прамфінпляну. Іх прозьвішчы ведаюць усе ўдарнікі заводу.

Адным з урачыстых момантаў вечару было: хто атрымае прэмію ў 5.000 руб. і пераходны заводзкі сьцяг.

Рабочыя кавальнага цэху выканалі свой дадаткова-сустрэчны плян—600 ціскоў. Яны адбіраюць сьцяг у ліцейшчыкаў, якія ня здолелі справіцца з ускладзенымі задачамі.

Пятнаццаць чалавек—прэміяваныя ўдарнікі кавалі прымаюць пераходны сьцяг ад ліцейшчыкаў і з гонарам абяцаюць утрымаць гэты сьцяг і ў трэцім годзе пяцігодкі.

Мэханічны цэх, як перадавы, атрымаў 5.000 руб., на якія набывае 2 аўтамабілі і 2 матацыклы. Свае тэмпы ён замацоўвае і на трэці год пяцігодкі.

За аддатую работу па хадайнічаньні рабочых такарнага цэху, узьнята хадайніцтва камунараўцамі аб ўзнагародзе майстра такарнага цэху тав. **Ерынгроза** ордэнам працоўнага сьцягу.

Вялікі энтузіязм рабочых заводу «Камунар», няўхільнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, бязьлітасная барацьба з правымі і «левымі» ўхілістамі забясьпечылі перавыкананьне прамфінпляну другога году пяцігодкі і ўдарнага кварталу. Сталёвае парткіраўніцтва і посьпехі, з якімі ўступілі камунараўцы ў трэці рашаючы год пяцігодкі зьяўляюцца парукай выкананьня прамфінпляну «Камунарам» і 3-га году, у якім тэмпы ўдарнага кварталу будуць захаваны.

Д. Х. Маркаў.

Бяз клясавага падыходу

У м. Чашніках арганізаваны курсы ЦІП. На курсы прымаюцца ўсе колы насельніцтва, пачынаючы з батрака і канчаючы заможнікам.

Адсюль, як вынік, калі на курсы было раней прынята 80 асоб, зараз засталося толькі 64, бо частка гэтых асоб дома мае заработак: возяць лес і інш.

Па гэтай прычыне склад вучняў ЦІП у Чашніках зьмяніўся. Выходзіць, што некалькі тысяч дзяржаўных грошай выкінуты на паветра, бо кожны вучань атрымлівае стыпэндыю. Для гэтых курсантаў ня складзены належныя ўмовы. Ніхто імі ня цікавіцца—глядзяць на курсантаў абыяк. РКК-РСІ трэба пацікавіцца гэтай справай.

Знайдун.

Лепшыя ўдарнікі заводу „Камунар“, якія атрымалі прэміі

Зьлева направа: т.т. ЕРЭНГРОС, РУБЕНЧЫК, ТАРАЕЎ, ШМЭРЛІС, НУДЭЛЬМАН, КОХАН, ГОБЭРМАН, ШЧАСНАЯ, РУБЕНЧЫК, МІТЭЛЬМАН, ЦУДНЯ і КАЦЭВІЧ.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Магільшчыкі самакрытыкі

Для аказаньня матэр'яльнай дапамогі гарадзкой беднаце ў Менску былі арганізаваны Менгаркамітэтам узаемадапамогі розныя майстэрні і прадпрыемствы. У гэтых майстэрнях і прадпрыемствах працавала дэклясаваная бедната. Там гэтыя рабочыя атрымлівалі працоўную дапамогу і адпаведную кваліфікацыю.

Такім чынам былі арганізаваны скрынячная майстэрня, люстэрачная фабрыка, сьлясарная майстэрня, утыльапрацоўчая майстэрня і інш.

Папаўшы на вытворчасьць дэклясаваная бедната пачала цікавіцца вытворчасьцю і рашуча змагацца з бесгаспадарчасьцю, якая панавала амаль што на ўсіх гэтых прадпрыемствах.

Але барацьба лепшай часткі рабочых гэтых майстэрняў за выкананьне промфінпляну і іх крытыка адразу знайшла вялікае супрацьдзеяньне з боку адміністрацыі і падхалімаў да яе. Асабліва супроць крытыкі зацяўся намесьнік старшыні камітэту—Табачнікаў. Замест таго, каб разгарнуць на падначальных яму прадпрыемствах здаровую бальшавіцкую самакрытыку як на палянцы працоўнай ... ў вытворчасьці, так і па барацьбе з безгаспадарчасьцю, Табачнікаў, наадварот, утварыў зажым крытыкі і душыў малейшае яе праяўленьне.

Гэты далакоп самакрытыкі зьнімаў з працы рабочых, якія адважыліся сказаць слова супроць яго. Усякае выступленьне сваіх рабочых з самакрытыкай ён называў «бузацёрствам». Карыстаючыся тым, што ўваходзіў у рэдкалегію насьценнай газэты, ён пільна сачыў за тым, каб не прапусьціць якой небудзь заметкі супроць сябе.

Акрамя гэтага Табачнікаў увёў у сваіх прадпрыемствах нячуваныя абставіны працы, якія мяжуюцца са зьдзекамі над працоўнымі, ігнаруючы ўсялякія нормы працоўнага заканадаўства і г. д.

Табачнікаў закупіў у Маскве ў прыватніка зусім няудальне абсталяваньне за якое заплаціў 2600 руб. Табачнікаў з Масквы запрасіў на працу ў Менск лжэспэца нейкага Партнога, якому заплаціў пад'ёмныя каля 500 руб. Табачнікаў выдаткаваў на свае нерацыянальныя поездкі ў Маскву каля 1000 руб.

Акрамя Табачнікава па гэтай справе абвінавачваюцца яшчэ некаторыя адказныя працаўнікі, якія зрывалі вытворчасьць працы, глушылі самакрытыку, сеялі нацыянальную звадку паміж рабочымі.

Усе гэтыя «супрацоўнікі» абвінавачваюцца па 196, 200, 84, 195 і інш. артыкулах К. К.

Па гэтай справе выклікаюцца 33 сьведкі. У хуткім часе справа гэта будзе разглядацца Вярхоўным Судом.

Р. Лад.

Паштовая скрынка

Сэрабранікаву—«Развал і бесгаспадарчасьць у будаўніцтве баракаў»—на кіравана ЦКК-РСІ.

С. Г—ка.—«Трэба палажыць канец шкодніцтву»—Лёзьненскі РайРСІ. Маленькаву—«Патрэбна пралетарскае сіта»—паслана на расьследаваньне.

Боську—«Пухавічы атрымалі суровую вымову»—аб гэтым ужо друкавалася. Зуду—«Место ли бесхозяйственности в Хуторском сельсовете»—накіравана на досьлед Чэрвенскаму РВК.

Г—ч.—«Усеагульнае навучаньне ў Віцебску»—накіравана НК Асьветы. Фарбэраву—аб распрацоўцы торфу—Астрашыцка-Гардзецкай РайРСІ ЛБК—«Дайце рады»—НКАсьветы. Войтку—«Непадрыхтаванымі сустрэлі навучальны год—Сьмілавіцкай РСІ.

Абчугскаму—«Шкоднікі»—паслана на досьлед Чарэйскай РСІ. Савіцкаму—«Настаўнікам не выдаюць зарплаты—рагачоўскай РСІ. Дубку—«Дзе шукаць праўды»—Пухавіцкай РСІ. Палякову—Топчуцца на месцы—Чашніскай РСІ.

Галінскаму—аб завочным навучаньні — друкавалася. Асьветніцы — «на культфронце г. Воршы прарывы» такі матэр'ял ужо ёсьць. Геніну—«Даць па руках»—друкавалася аб гэтым некалькі разоў.

Чакаючаму—«Ці хутка зьнішчаць валакіту—накіравана Чарэйскаму Рай МК саюзу працасьветы. Пырвю—«Шкоднікі арудуюць»—Пятрыкаўскай РСІ.

С. З.—допісаў бяз подпісу мы не скарыстоўваем. Шустару—адказ на маленькі фэльетон—пераслана НКАсьветы. Штыку—«Благадзецель Заг. 7-годкі»—Азарыцкай Райіна. Дарашэвіч—«Забясьпечылі»—Каралінскаму РВК.

П. К. Б.—«Паштовая сувязь—накіравана Вульскаму РВК. Лашанцу—«Маленькая няўвязка ў вялікай справе»—Узьдзенскай РСІ. Мацлеўскаму—«Бюракратычныя адносіны да справы ўсеагульнага навучаньня»—Мазырскаму РВК.

А. Зоркаму—«Культэстафэта павінна зрабіць зрух»—пра ваш раён ужо друкавался. К.—«Пара раскачацца»—было.

Калашу—«Выкарчаваць астаткі апартунізму»—паслана на досьлед, Барысаўскай РСІ. Антосеву—«Распаўсюджаньні пазыкі»—Капаткевіцкаму Рай МК працасьветы. Пайніку № 0000—«Злачынцы ў спажыўтаварыстве»—Коханаўскай РСІ.

М. З-ч—«Забыліся», Р. Кагану—«Наш рапарт», Балзоўскаму «Да культпаходу», Я. Марозаву—«Уключыліся ў культэстафэту», Сыпіцэвічу—«Расольшчына ўключылася ў культэстафэту», да друку ня пойдуць, дадзены ў зводку.

Барабанаву — «Аб культэстафэце», Мельнікаву М.—«Забылі пра культэстафэту», Вішні—«Тэхнікум пляцецца ў хвасьце», Турскаму—«Аб культэстафэце», да друку ня пойдуць, дадзены ў зводку.

П-у—«У баку ад культэстафэты», Астапу з Высокай Горкі—«Аб культэстафэце ня ведаюць», Вішні—«Арганізаваны пасты па правядзеньні культурнай эстафэты». А. Зоркаму—«Партыйна-камсамольскія арганізацыі чаго чакаюць?»—аб гэтым ужо зьмяшчалася.

Рысьнянцу—«Галавацяпаў пад суд» накіравана пракурору. Кветцы—«Саўгас патрабуе аздараўленьня»—Белсельтрэсту. А. Зоркаму—«Даць рашучы адпор»—Пухавіцкаму РК КП(б)Б.

Оваду—«Шкоднік шкодніка высоўвае на вышэйшую пасаду»—аб гэтым было зьмешчана. Таварышу—«Яшчэ адзін са зграй славутых уцекачоў», Я. Жылку—«Прынялі ўдзел», Вайноўскаму—«Дэзэртыра з працоўнага фронту вярнуць на месца», Ян. Ялаву—«З рэйду па Псоцкім с-савеце», да друку ня пайдуць, матэр'ял устарэў.

Гвазду—«Камуніст папаў пад уплыў лішэнца» паслана на досьлед Белсельтрэсту.—Васіленку—«Шкоднікі зрываюць калгаснае будаўніцтва»—Наркамзему. Лебедзеву—«Мацней ударым па права-апартунізму»—ЦКК-РСІ.

ТЭАТР-КІНО

Беларускі Другі Дзярж. тэатр	Назначаны на 11 студзеня паказ для Менрайпромсаюза **„1-я конная“** пераносіцца на 10 студзеня. Усе білеты сапраўдны.
Кіно-тэатр „Культура“	З панядзелка 5 студзеня новы нямецкі фільм **„Нявольнікі бледнай гары“** драма ў 7 частках. Хроніка сакзкіно № 62. Пачатак а 7 гадз. Каса ад 5 гадз
Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“	З панядзелка 5 студзеня З прычыны вялікага посьпеху 2-гі тыдзень пастаноўкі гістарычнага фільму **„Паэт і цар“** пачатак а 6 г.30 хв. Каса а 4 з пал. гадз.
Кіно „ПРАЛЕТАРЫ“	ІГАР ІЛЬЛІНСКІ ў лепшай камэдыі сэзона **„Сьвята сьв. Іоргена“** у 7 частках. Пачатак а 6 гадзіне. Каса ад 4 з паловай гадз.
Дзіцячы кіно-тэатр „ЮНЫ ПІЯНЭР“	Ад панядзелка 5 студзеня 1-ая сэрыя **„Чырвоныя дзьяваляты“** Пачатак а 1-й гадзіне Каса а 12.
Кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“	Ад 5 студзеня мастацкі фільм **ГАРАДЫ І ГОДЫ** Драма ў 9 частках. 2. ХРОНІКА САЮЗКІНО № 69. 3. ГУКАВЫ КІНО-КАНЦЭРТ. Пачатак а 7 гадз. Каса ад 5 гадз

ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА НА 1931 ГОД

на навукова-дасьледчую, навукова-папулярную масавую краязнаўчую часопісь

„САВЕЦКАЯ КРАІНА“

„Савецкая краіна“—навукова-дасьледчая, навукова-папулярная, марксыцка-ленінская краязнаўчая часопісь—зьмяшчае артыкулы навукова-дасьледчага, навукова-папулярнага,налтычна-масавага, публіцыстычнага, апісальнага характару, а таксама краязнаўчыя нарысы, марксыцка-ленінскую крытыку, рэцэнзіі і бібліяграфію.

„Савецкая краіна“—магутны барацьбіт за марксыцка-ленінскую ідэалёгію, за дыялектычны мэтад Маркса-Леніна ў краязнаўстве і навуцы, магутны барацьбіт за генэральную лінію камуністычнай партыі.

„Савецкая краіна“—ваяўнічы змагар з варожымі марксызму-ленінізму плынямі ў краязнаўстве і навуцы, ставіць задачы ваяўнічага змагацца з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам, за пралетарскую навуку і культуру, за савецкае краязнаўства.

„Савецкая краіна“—ставіць задачай мабілізацыю шырокіх мас на дасканалае навуковае дасьледваньне прадукцыйных сіл БССР у інтарэсах сацыялістычнага будаўніцтва і на непасрэдны ўдзел у гэтым будаўніцтве.

„Савецкая краіна“—за савецкае краязнаўства.

„Савецкая краіна“—за перабудову ўсёй краязнаўчай працы на новых вытворчых асновах. Кожны завод, кожная фабрыка, кожны саўгас, калгас—даёш краязнаўчыя ячэйкі для вывучэньня прадукцыйных сіл у інтарэсах пасьпяховага сацыялістычнага будаўніцтва.

„Савецкая краіна“—арыентуецца на масавага краязнаўцу Партыйцы і камсамольцы, беспартыйныя рабочыя, калгасьнікі, батракі, бедната і лепшая частка серадпякоў, студэнтства, вучнёўская моладзь вясковая і гарадзкая інтэлігенцыя, а даная справе сацыялістычнага будаўніцтва—актыўна пішэце ў часопісь вашы краязнаўчыя допісы.

Часопісь „Савецкая Краіна“ выходзіць раз у месяц

Умовы падпіскі: на год—4 р.; на 9 мес.—3 р. 25 к.; на паўгода—2 р. 25 к.; на 3 мес.—1 р. 25 к.; на 1 мес.—50 к.

Падпіска з кожнага месяца.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: у бюро падпіскі „Кніга поштай“ (Менск, пляц Волі, 5), у рэдакцыі часопісі (Менск, рог Леніна і Універсытэцкай, 29-35 Краязнаўства), ва ўсіх паштовых аддзяленьнях, у раённых і акруговых краязнаўчых арганізацыях і ва ўсіх кнігарнях Белдзяржвыдавецтва і інш.

Пастанова

Народнага Камісарыяту Працы БССР

7 студзеня 1931 г. № 1-69 гор. Менск

Пра забесьпячэньне народнае гаспадаркі рабочай сілай на 1931 г.

Разгорнутае сацыялістычнае наступленьне і шпаркі рост сацыялістычнага сэктару як прамысловасьці, так і сельскай гаспадаркі выклікалі вялізарную патрэбнасьць у рабочых кадрах для нанова-будаваных і рэканструяваных прадпрыемстваў прамысловасьці, транспарту і сельскае гаспадаркі.

Здавальненьне гэтай патрэбнасьці высоўвае задачы поўнага пераходу на плянавае забясьпечаньне народнае гаспадаркі рабочымі кадрамі.

У сувязі з гэтым і на падставе пастановы Савету Народных Камісараў БССР за 23-XII 1930 г.—**Народны Камісарыят Працы БССР пастанаўляе:**

1. Плянавае забясьпечаньне народнае гаспадаркі рабсілай робіцца кіраўніцтвамі кадраў (быўш. біржы працы), а там, дзе іх няма, інспэктарамі працы, на падставе распрацоўваных гаспадарчымі арганізацыямі, ведамствамі і ўстановамі плянаў патрэбнасьці рабсілы і пакрыцьця гэтай патрэбнасьці.

2. Органы Працы павінны актыўна ўдзельнічаць у распрацоўцы гэтых плянаў сумесна з адпаведнымі прафсаюзамі, мабілізуючы рабочую грамадзкасьць, шырока разгарнуўшы сыстэму сустрэчных плянаў, дабіваючыся максымальнага і рацыянальнага скарыстаньня рабсілы, унядрэньня жаночай працы ў вытворчасьці і стварэньня матэрыяльна-бытавых умоў, якія забясьпечваюць максымальнае скарыстаньне жаночай працы.

3. Практычнае выкананьне распрацаваных плянаў забясьпечаньня рабсілай павінна праводзіцца на падставе спэцыяльных дагавораў заключаных паміж зацікаўленымі арганізацыямі і мясцовымі органамі працы.

У гэтых дагаворах прадугледжваецца:

а) колькасьць і спэцыяльнасьць патрэбнай рабочай сілы;

б) тэрміны, у якія павінна быць прадстаўлена рабочая сіла;

в) умовы працы і быту; заработная плата, забясьпечаньне струмэнтамі і спэцвопраткай, жыльлём, харчаваньнем і інш. бытавымі ўмовамі, якія стымулююць замацаваньне рабочых на працяжны тэрмін;

г) парадак і формы ўзаемнай адказнасьці органаў працы і зацікаўленых прадпрыемстваў і арганізацый.

4. Абавязаць усе прадпрыемствы, установы і арганізацыі Саюзнага, рэспубліканскага і мясцовага значэньня падаць свае апэрацыйныя пляны патрэбнасьці рабсілы і пакрыцьця гэтай патрэбнасьці, разам з апэрацыйнымі плянамі падрыхтоўкі рабочых кадраў мясцовым органам працы і ў копіі свайму гаспадарчаму аб'яднаньню або ведамству.

Цэнтральныя ўстановы і арганізацыі на падставе плянаў паасобных прадпрыемстваў падаюць у Наркампрацы БССР зводныя пляны патрэбнасьці і пакрыцьця рабочых кадраў разам з апэрацыйнымі плянамі падрыхтоўкі рабочых кадраў.

5. Паказаныя ў арт. 4 пляны падаюцца паводле далучаных інструкцый і форм у наступныя тэрміны:

а) прадпрыемствы, установы і арганізацыі да 20-га студзеня 1931 г. у мясцовыя органы працы і сваім аб'яднаньням;

б) аб'яднаньні і інш. цэнтральныя ведамствы і ўстановы да 25-га студзеня г. г. у Наркампрацы БССР.

6. Выходзячы з таго, што плянаваньне патрэбнасьці рабочых кадраў зьяўляецца неадлучнай часткай промфінпляну — прадпрыемствы і ўстановы пры складаньні плянаў, павінны кіравацца наступным:

а) сапраўднай патрэбнасьцю ў рабсіле з улікам максымальнай эканоміі ў скарыстаньні наяўнай рабсілы, шляхам правільнай арганізацыі працы ў вытворчасьці, рацыяналізацыі вытворчых працэсаў, выяўленьня лішкаў рабсілы, шляхам імкненьня пакрыць патрэбнасьць у кваліфікаваных кадрах за лік поўнага скарыстаньня ўнутраных вытворчых рэсурсаў і розных форм падрыхтоўкі і плянава арганізаванай перасоўкі унутры самой вытворчасьці з ніжэйшых кваліфікацый на вышэйшыя;

б) канчаткова зацьверджанымі кантрольнымі лічбамі для данага прадпрыемства і ўстановы на 1931 г., заданьнямі па вытворчай праграме і якаснымі паказьнікамі, лімітамі па капітальных укладаньнях і асыгнаваньнямі на падрыхтоўку кадраў на 1931 г.;

в) неабходнасьцю стварэньня сталых кадраў рабсілы ў сэзонных галінах (лесазагатоўкі, торфараспрацоўкі і інш.);

г) максымальнага ўкараненьня жаночай працы ў вытворчасьці і падвышэньня кваліфікацыі працуючых жанчын.

7. Адказнасьць за складаньне плянаў, своечасовага іх прадстаўленьня і выкананьня ў частцы, якая ўскладаецца на прадпрыемствы, нясуць кіраўнікі прадпрыемстваў і ўстаноў і асобы, адказныя за наём, звальненьне і скарыстаньне рабочай сілы ў парадку прадугледжаным пастановай ЦВК і СНК СССР за 15-XII 1930 г. (Изв. ЦВК і СНК СССР ад 17-XII—1930 г.).

Народны Камісар Працы БССР **Гіліякевіч.**

Ст. Інспэктар па кадрам НКПБ **Конікаў.**

Інструкцыя

для складаньня пляну патрэбнасьці ў рабсіле і пакрыцьця гатай патрэбнасьці народнай гаспадаркі БССР на 1931 год

І. Агульная частка.

1. Усе прадпрыемствы, установы і аб'яднаньні, як прамысловасьці, так і іншых галін народнай гаспадаркі складаюць плян патрэбнасьці ў рабсіле і пакрыцьця гэтай патрэбнасьці на 1931 год. Па сталых галінах народнай гаспадаркі плян складаецца па форме № 1, па тых галінах народнай гаспадаркі, дзе пераважае сэзонная рабочая сіла, па форме № 2. Тыя прадпрыемствы і ўстановы, якія маюць мерапрыемствы па падрыхтоўцы кадраў павінны дадаткова даць зьвесткі па форме № 3. Разам з плянам абавязкова дадаецца тлумачальная запіска, асьвятляючая пытаньні, адзначаныя ў ф. № 1 і 2.

2. Цэнтральныя, гаспадарчыя аб'яднаньні, установы і ведамствы зводныя пляны патрэбнасьці ў рабсіле і пакрыцьця гэтай патрэбнасьці складаюць у наступным парадку:

а) па ўсёй цэнзавай прамысловасьці і па саўгасах, па паасобных прадпрыемствах з групоўкай па аб'яднаньнях.

б) Па ўсіх іншых галінах народнай гаспадаркі—па паасобных работах у разрэзе гарадоў і адміністрацыйных раёнаў з падзяленьнем па галіны народнай гаспадаркі.

ІІ. Тлумачэньне да запаўненьня дадатку № 1.

1. У гр. 1 трэба ўпісаць прафэсіі: рабочых, служачых і інш., якія маюцца на данным прадпрыемстве, за выключэньнем адміністрацыйна - тэхнічнага пэрсаналу і інш. спэцыялістых вышэйшай і сярэдняй кваліфікацыі, якія ў гэтым пляне ня ўлічваюцца.

2. У гр. 2 кожную прафэсію трэба разьбіць на кваліфікацыі, якія адзначаны ў гэтай графе.

3. У гр. 3-5 паказваецца колькасьць асоб, якія былі заняты на канец 1930 г. У гр. 6-8 паказваецца праектоўка да 1931 года і гр. 9-12 па паасобных кварталах. Гэтыя даныя павінны паказаць лік асоб, якія будуць працаваць на канец году і кожнага кварталу.

4. Дадатковая патрэбнасьць вылічваецца, як розьніца, паміж канцом 1931 г. і канцом 1930 г. У тых выпадках, калі дадатковая патрэбнасьць будзе паказана больш, альбо менш розьніцы, дык прычыну гэтую трэба асьвяціць у тлумачальнай запісцы.

5. У крыніцах пакрыцьця дадатковай патрэбнасьці ўлічваюцца ўсе фізычныя асобы, адзначаныя ў гр. 13, прычым вышэйшых, сярэдніх і паўкваліфікаваных у большай частцы трэба праектаваць пакрыцьце за лік унутранай падрыхтоўкі, як-то: праз ФЗВ, ШУМП, Прафшколы, брыгаднае вучнёўства, каротка-і доўга тэрміновыя курсы і г. д.

6. Перавод з іншых прадпрыемстваў (гр. 24, 25) прадугледжвае віды перакідак як унутры данага аб'яднаньня, так і меркаванага ўцягненьня з іншых прадпрыемстваў, за выключэньнем пераводу з саматужнай прамысловасьці, якія падлічваюцца ў гр. 26, 27.

Увага: Да п. п. 5 і 6. Калі прадпрыемству невядома колькасьць асоб, якія будуць перакінуты з іншых прадпрыемстваў, або колькасьць скончыўшых розныя формы падрыхтоўкі (у тым выпадку, калі яны ўтрымліваюцца аб'яднаньнем, альбо даным ведамствам), дык гэтыя даныя запаўняюцца вышэйстаячымі аб'яднаньнямі, альбо ведамствамі.

7. Праектоўка ў плянах для атрыманьня рабсілы праз органы працы, павінна прадугледжваць пераважна некваліфікаваную рабсілу як непасрэдна на вытворчасьці, таксама і на замену перасунутых у павышаныя кваліфікацыі і камплектаваньне розных форм падрыхтоўкі.

8. Гр. 36-43 запаўняюцца мясцовымі органамі працы з удзелам прадпрыемства і адпаведных савецкіх, партыйных і прафэсыянальных арганізацый.

9. Плян забясьпячэньня рабсілай новых прадпрыемстваў складаецца пры абавязковым удзеле мясцовых органаў працы, прычым, для камплектаваньня асноўнага кадра рабочых павінна быць прадугледжана перасоўка з іншых прадпрыемстваў.

ІІІ. Паясьненьне па запаўненьні бланку № 2.

1. У гр. 2 пры запаўненьні неабходна адзначыць па кожнай прафэсіі першым радком—агульную колькасьць патрэбных чалавека-дзён у м-ц, другім радком — колькасьць патрэбных фізычных асоб, выходзячы з паказаньняў колькасьці чалавека-дзён і трэцім радком паказваецца колькасьць сталых рабочых павінна працаваць з агульнай колькасьці фізычных асоб.

2. Патрэбная колькасьць рабсілы па месяцах (з гр. 3 па 26) вылічваецца, выходзячы з зацьверджанай праграмы работ для кожнай прафэсіі з разьбіўкай, паказанай у п. 1.

3. У разьдзеле «крыніцы пакрыцьця» п. 33 неабходна паказаць пажаданыя пункты вярбоўкі (раён, сельсавет, вёска).

ПЛЯН

ДАДАТАК № 1.

патрэбнасьці і пакрыцьця рабочай сілы ў 1931 годзе.

СТАЛЫЯ ГАЛІНЫ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ

Назва прадпрыемства__________ каму падпарадкаван па__________

назва адм. раёну__________

НАЗВА ПРАФЭСІІ	Кваліфікацыя	Патрэбнасьць у рабсіле. Фізычн. асоб на канец году альбо кварталу. 1930 год: Усяго	1930 год: У т. ліку жанчын	1930 год: Удз. вага жанчын	1931 год: Усяго	1931 год: У т. ліку жанчын	1931 год: Удз. вага жанчын	31 г. па кварт.: На 1-IV	На 1-VI	На 1-X	На 30-XII	Дадатковая патрэбн. 1931 г.	Крыніцы пакрыцьця: ФЗВ і ШВМП	Праф. школы	Інд. брыг. вучн.: Усяго	Інд. брыг. вучн.: У т. ліку жанчын	Кар. тэр. курсы: Усяго	Кар. тэр. курсы: У т. ліку жанчын	Перас. з навуч.: Усяго	Перас. з навуч.: У т. ліку жанчын	Перас. без навуч.: Усяго	Перас. без навуч.: У т. ліку жанчын	Перав. з інш. прадпр.: Усяго	Перав. з інш. прадпр.: У т. ліку жанчын	Перав. з сам. прам.: Усяго	Перав. з сам. прам.: У т. ліку жанчын	Органы працы. Праз ЦІП і розн. курсы: Усяго	Праз ЦІП і розн. курсы: У т. ліку жанчын	Непасрэд. на выт.: Усяго	Непасрэд. на выт.: У т. ліку жанчын	Зам. перасов.: Усяго	Зам. перасов.: У т. ліку жанчын	Усяго орг. працы: Усяго	Усяго орг. працы: У т. ліку жанчын	З іх за лік уцягненьня. Сям'і рабоч.: Усяго	Сям'і рабоч.: Жанчын	Інш. насельн.: Усяго	Інш. насельн.: Жанчын	Калгасьн.: Усяго	Калгасьн.: Жанчын	Не калг.: Усяго	Не калг.: Жанчын
1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12	13	14	15	16	17	18	19	20	21	22	23	24	25	26	27	28	29	30	31	32	33	34	35	36	37	38	39	40	41	42	43
	Вышэйшая																																									
	Сярэдняя																																									
	Паўквал.																																									
	Некваліф.																																									
	Вышэйшая																																									
	Сярэдняя																																									
	Паўквал.																																									
І г. далей.	Некваліф.																																									

УВАГА: У тлумачальнай запісцы абавязкова паказваецца: а) вытворчая праграма (у фізычным аб'ёме і грашовым выразе) за 1930 г. агульн. і выкананьне пляну, а за 1931 г. па кварталах; б) вытворчасьць працы за 1930 г. і на 1931 г.; в) агульная колькасьць рабочых па зьменах: мужчын, жанчын; г) тэрмін пераводу прадпрыемства на 7 гадз. дзень і на беспераныўку і ў сувязі з гэтым дадатковыя патрэбнасьці у рабсіле; д) характарыстыка культурна-бытавых і жыльлёвых умоў, а таксама мерапрыемствы на 1931 г.; е) працэнт выкананьня пляну рабсілы

Сэзонныя рабочыя

Дадатак № 2.

Плян патрэбнасьці рабочай і гужавой сілы ў 1931 годзе

Назва гаспадарчай арганізацыі__________ назва адміністр. р-ну__________

№ п.-ч.	НАЗВА ПРАФЭСІІ	Усяго павінна працаваць па месяцах на працягу 1931 г. I: Усяго	I: У т. л. жанч.	II: Усяго	II: У т. л. жанч.	III: Усяго	III: У т. л. жанч.	IV: Усяго	IV: У т. л. жанч.	V: Усяго	V: У т. л. жанч.	VI: Усяго	VI: У т. л. жанч.	VII: Усяго	VII: У т. л. жанч.	VIII: Усяго	VIII: У т. л. жанч.	IX: Усяго	IX: У т. л. жанч.	X: Усяго	X: У т. л. жанч.	XI: Усяго	XI: У т. л. жанч.	XII: Усяго	XII: У т. л. жанч.	Крыніцы пакрыцьця патрэбнасьці. Працуе ў гаспад. арганізацыях на 1-І-931: Усяго	Працуе ў гаспад. арганізацыях на 1-І-931: У т. л. жанчын	Кольк. падрыхтаваных гаспадар арганіз.	Пажадана атрымаць з падрыхтаван. на курсах орг працы	Перасоўка з іншых прафэсій	Неабходна навербаваць	Пажаданыя пункты вярбоўкі	Увага
1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12	13	14	15	16	17	18	19	20	21	22	23	24	25	26	27	28	29	30	31	32	33	34
1	чал. дзен																																
	фізыч. асобы																																
	У т. л. сталых																																
2	чал. дзен																																
	фізыч. асобы																																
	У т. л. сталых																																
	і г. д.																																

УВАГА 1. У тлумачальнай запісцы абавязкова паказваецца: а) вытворчая праграма (у фізычным аб'ёме і грашовым выразе) за 1931 г. і па кожнаму кварталу 1931 г. паасобку; б) норма выпрацоўкі на адзінага ў дзень, в) па вывазцы—сярэдняя адлегласьць возкі; г) характарыстыка культурна-бытавых і жыльлёвых умоў, таксама мерапрыемствы на 1931 г.

УВАГА 2. У гр. 2 неабходна пералічыць усе патрэбныя прафэсіі, а таксама чарнарабочых і возчыкаў з коньмі.

ДАДАТАК № 3

ПАДРЫХТОЎКА МАСАВЫХ КАДРАЎ

Назва гораду, альбо раёну__________ школы ФЗВ, ШВМП, савгасвучы, будвучы, калінарвучы, канторвучы, базы „ЦІП“ і розн. інш каротка-тэр. кур.

НАЗВА ФОРМ ПАДРЫХТОЎКІ	КАМУ НАЛЕЖЫЦЬ	Назва профэсіі	Тэрмін навучаньня	Выпуск 1930: Усяго	Выпуск 1930: У тым ліку жанч.	Склад вучняў 1931 году. Перах. з мін. году: Усяго	Перах. з мін. году: У тым ліку жан.	Прыём 1931 году: Усяго	Прыём 1931 году. У тым ліку: Жанчын	Рабочых	Батракоў і калгасьн.	Сябры праф. і іх сем'і	Бедн. і колгасьн.	Выпуск 1931 г.: Усяго	Выпуск 1931 г.: У тым ліку жанчын	Месяц калі мяркуецца выпуск			Бягуч. выдаткі: Усяго	На стыпэнд.	Разьм. мес. стыпэн.	Выдаткі на капіт. будаўніцтва	УВАГА
1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12	13	14	15	16	17	18	19	20	21	22	23	24

АПАВЯШЧЭНЬНЕ.

Сацыяльна-бытавы сэктар ЦСПСБ склікае 9 студзеня, а 7 гадзіне ўвечары ў залі пасяджэньняў ЦСПСБ, пакой 10, нараду па пытаньні «аб дзейнасьці Інстытуту Аховы Працы пры НКП БССР».

Дакладчык—дырэктар Інстытуту С. Р. Дзіхцяр.

На нараду выклікаюцца кіраўнікі сац. бытавых сэктараў ЦП саюзаў, кіраўнікі сацыяльна-бытавых сэктараў Фабзаўмясцкомаў (был. Камісіі па ахове працы), старшыні Наркампрацы, ВСНГ, НК Аховы Здароўя, Гарздраву, Гар. Інспэктароў Працы, Гар. Страхкасы, газэт, навукова-дасьледчых устаноў і наступныя таварышы:

Бакштэйн І. М., Хмяльніцкі І. І., Дапаліцкі М. Б., Хлаўновіч М. Ц., Тарноўскі Е. Г., Левін Г. І., Левін А. Б., Крывашэяў А. І., Літаўскі І. Е., Гольд, Ледэр, Вэйнгаўз, Яўлоцкі І. Б., Сандлер В. М., Пропас Е. В., Арлюк А. А., Загельштайн С., Цыгвар І. Г., Курган П. Я., Файбушаў Г. М., Зуеўскі В. К., Кручэц Н. Н., Барак Я. М., Ружынскі, Вольфсан, Чарвякоў К. В., Кантар М. А., Рохкінд Ф. Ш., Жукаборскі С. І., Нісане Р. З., Буршгейн Ф. Г., Сагаловіч А. Х., Доўнар Ф. Ф., Эстэркін Б. Ф., Майзэль Н. А., Шайкоўскі А. С., Кабакоў І. К., Гітлін, Паўлаў, Андрэяў А. П., Эльтэрман Р. Г., Левін А. К., Голуб'яў А. І., Фрыдман Н. А., Скорабагаты М. І.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ЗГУБЛЕНЫ

Кніжка Глухоўскай В. С. — выд. Менскай Прафшколай Швэйнікаў, кв. № 540.

Лічная кніжка Берасьневіча В. М.—выд. Менакрваенкаматам, кв. № 541.

Пасьведчаньне Гіндзіна М. С., выд. 2-й сямігодовай школай, кв. № 542.

Даведка аб нараджэньні Рык-Станкевіч О. Д. — выд. 1-м Радзільным Домам за № 1954, кв. № 543.

Вайсковая кніжка Рабушка М. В.—выд. Менакрваенкаматам, кв. № 544.

Біржавая картка Кугеля К. А.—выд. Менбіржай Працы, кв. № 545.

Пашпарт Наўмчыка В. К. — выд. 2-м аддз. міліцыі, кв. № 546.

Даведка аб працы Наўмчыка В. К. — выд. Белмясгандлем, кв. № 547.

Біржавы талён Хасеневіч А. — выд. Менбіржай Працы, кв. № 548.

Мэтрычн. выпіс Розэнбэрг Б. Я. выд. Менскім Загсам кв. № 654.

Выканаўчы ліст Карэнскай М. выд. Лагойскім Нарсудом, кв. № 656.

Картка на каня № 4185 Хандохіна С. Ф. выд. Дрыбінск. РВК кв. 657.

Мэтрычны выпіс Ламака В. А. выд. Менскім Загсам, кв. № 658.

Саюзны білет № 9 Саранковай М. Д. выд. саюзам с.-г. лес. рабочых кв. 659.

Член. кніжка № 18819 Ясінскай Я. Ф. выдан. Бабруйск. мясцкомам саюзу сел. гас. лес. рабочых кв. № 660.

Паляўнічы білет Забаўскага А. М. выд. саюзам паляўнічых кв. № 661.

Камсамольскі білет № 200333 Узьлянера Х. М. выд. Менакружкомам КСМ кв. 662.

Мэтрычны выпіс Узьляпера Х. М. выдан. Менскім Загсам, кв. № 663.

Сяброўская кніжка № 204 Савенка Б. выдан. Мазырск. спажыв. т-вам «Смычка» кв. № 1297-п.

Лічная вайсковая кніжка Елкасава ... выд. Мсьціслаўскім РВК, кв. 1298-п.

Вайсковы білет Акуліча В. П. выд. Чэрвенскім вайсковым сталом кв. 1299-п.

Пасьведчаньне Старавойтавай В. Е. выдан. ІІ-й 7-годкай аб тым, што яна зьяўляецца вучн. VII групы кв. № 1302-п.

Кніжка касы ашчаднасьці № 3033, выдан. Нараўлянскім пашт. аддз. па імя Дзямідоўскага сельсавету кв. № 1303-п.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Лінейная калібровочная мішэнь LRT-BE4-V2